

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень
**20 КАНАЛАЎ**



«Разборкі» вакол музычнай прэміі
СТАР. 3



Для сэрца і сасудаў — марская капуста
СТАР. 8

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
20 СНЕЖНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 240 (27605) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПАСПЕЦЬ ДА НОВАГА ЎРАДЖАЮ

**Узровень тэхнічнай аснашчанасці прадпрыемстваў ільняной галіны неабходна павышаць. Такую задачу паставіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч у час наведвання ААТ «Слуцкі льнозавод», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Слуцкі завод уваходзіць у шасцёрку льнозаводаў, мадэрнізацыю якіх плануецца завяршыць да прыняцця ўраджаю 2014 года. Міхаіл Мясніковіч пабываў як на дзеючай вытворчасці, так і на пляцоўцы цэха, які будуецца. Першае, што было адзначана ім,— гэта недастатковая тэхнічная аснашчанасць прадпрыемства. Паводле слоў прэм'ер-міністра, гэта праблема актуальная і для іншых ільназаводаў. «Неабходна дааснашчаць прадпрыемствы»,— падкрэсіў кіраўнік урада. І ў першую чаргу, на яго думку, трэба закупляць адпаведныя механізмы па пад'ёму льнотрасты.

У цэлым, закранаючы льнозаводы, якія мадэрнізуюцца, Міхаіл Мясніковіч адзначыў: «Частка з іх знаходзіцца ў даволі добрым стане. Перш за ўсё гэта заводы ў Карме, Карэлічах. Разам з тым ёсць заводы на крытычным шляху — гэта льнозаводы ў Ляхавічах, Арэхаўску». У гэтым спісе знаходзіцца і Слуцкі льнозавод. Тут, як адзначыў Міхаіл Мясніковіч, назіраецца значнае адставанне ад графікаў. У сувязі з гэтым кіраўніцтву прадпрыемства дадзены даручэнні, якія дадуць магчымасць выправіць сітуацыю.

«Сёння ёсць усё неабходнае фінансаванне, абсталяванне пад усе шэсць заводаў,— адзначыў прэм'ер.— Ёсць упэўненасць у тым, што ўсе яны будуць уведзены ў эксплуатацыю для перапрацоўкі ўраджаю 2014 года».

■ Парламенцкі дзённік

## Чаму донарства павінна стаць бязвыплатным?

**У праекце Закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях донарства крыві і яе кампанентаў» прапагандуецца бязвыплатная здача крыві.**

Гэта асабліва падкрэсліў у размове з журналістамі Віктар ЛІСКОВІЧ, член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Закон быў прыняты на ўчарашнім пасяджэнні трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні.

У новым Законе вызначаны крыніцы фінансавання не толькі самога донарства, але і іншых мерапрыемстваў непасрэдна з ім звязаных. «Асобным артыкулам акрэслены асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы. Тут значная ўвага надаецца бязвыплатнаму донарству», — адзначыў Віктар Лісковіч. Дарэчы, такога кшталту донарства абумоўлена тым, што лічыцца найбольш асэнсаваным і бяспечным. Зараз у 60 краінах свету 95% усіх людзей, якія здаюць кроў, не атрымліваюць за гэта грашовага ўзнагароджання. Пастаўлена задача, каб да 2020 года большасць краін перанялі менавіта такую схему працы з донарамі.

Таксама ў гэтым праекце заканадаўча вызначаны ўзаемаадносіны паміж работнікамі-донарамі і іх наймадаўцамі. Сёння наймальнік абавязаны адпусціць донара для здачы крыві або, калі ўзнікае пэўная сітуацыя, звязаная з вытворчай неабходнасцю, прызначыць іншы дзень для гэтага. У сваю чаргу, работнік павінен папярэдзіць наймадаўцу за два дні пра тое, што ён будзе планава здаваць кроў.

Праектам Закона канкрэтызуецца аплата. Як удакладніў **Васіль ЖАРКО, міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь,** у выпадку здачы крыві ў працоўны час работнік вызваляецца ад працы з захаваннем сярэдняга дзённага заробку. Калі кроў здае навучэнец пэўнай вучэбнай установы, то ў дзень здачы крыві ён вызваляецца ад заняткаў, а таксама атрымлівае грашовыя выплаты.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

## МІНСК ЯК КНІЖНАЯ СТАЛІЦА



*Сталічная кнігарня «Кнігі энд кніжачкі» задаволіць чытвом любога кніжнага гурмана.*
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінск рыхтуе заяўку на атрыманне звання кніжнай сталіцы свету 2017 года. Акурат у 2017-м Беларусь адзначыць 500-годдзе нацыянальнага кнігадрукавання: у 1517 годзе ў Празе беларускі асветнік і першадрукар Францішак Скарына выдаў першую друкаваную кнігу «Псалтыр», а пазней надрукаваў ілюстраваную Біблію ў перакладзе на старабеларускую мову.

Званне кніжнай сталіцы свету штогод прысуджае аргкамітэт Міжнароднай Федэрацыі кнігавыдаўцоў, Міжнароднай федэрацыі кніжных гандляроў і Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый пад эгідай ЮНЕСКА. У выбраным горадзе зазвычай ладзіцца мноства кніжных мерапрыемстваў, акцый, выстаў і канферэнцый, накіраваных, у тым ліку, на папулярызацыю чытання. Але для таго, каб атрымаць ганаровы тытул, трэба выканаць шэраг умоў. Вырашальнай з'яўляецца падрыхтоўка найлепшай праграмы папулярызацыі чытання і кніг на роднай мове. Пры Міністэрстве культуры ўжо створана рабочая група па падрыхтоўцы праграмы мерапрыемстваў. Але якія шанцы ў Мінска атрымаць званне кніжнай сталіцы свету, што для гэтага трэба пераадолець і зрабіць? Падрабязней чытайце ў наступным нумары.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый ЖАДОБІН:**

***«У Беларусі ў агляднай будучыні не будзе 100-працэнтнай кантрактнай арміі. Узброеныя Сілы фарміруюцца, зыходзячы з тых задач, якія ставіць перад імі дзяржава. У Беларусі такая задача адна — ахова суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці, прававых асноў дзяржавы. Для эфектыўнага выканання гэтай задачы неабходна рыхтаваць прафесіянальны, добра навучаны рэзерв. І самая лепшая магчымасць падрыхтаваць такі рэзерв — гэта тэрміновая ваенная служба».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9470,00 | ▲ |
| Еўра | 12960,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 287,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1141,65 | ▼ |

## ЛЕТАПІС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Урачысты сход, прысвечаны 55-годдзю грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз журналістаў», адбыўся ў Мінску. Перад прадстаўнікамі творчых калектываў газет, часопісаў, радыё, тэлебачання было зачытана віншаванне ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Журналістаў горача віталі кіраўнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу, якія прыбылі на свята, вядомыя артысты.



Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




■ Злоба дня

## «НЕ ПЛАЦІЛА І НЕ БУДУ ПЛАЦІЦЬ!»

### БЕЗБІЛЕТНІКІ ПРАЯЎЛЯЮЦЬ УСЁ БОЛЬШУЮ АГРЭСІЮ Ў ТРАНСПАРЦЕ

**Больш за дваццаць гадоў езджу са свайго спальнага раёна горада на працу, па сутнасці, адным транспартам. Некаторых хранічных безбілетнікаў, можна сказаць, ведаю ў твар. Ну, вось напрыклад, хударлявая самавітая жанчына гадоў 70 ніколі не прабівае талона.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

…Калі б не бачыла колькі разоў, як спрабуюць націснуць на яе сумленне кантралёры, падумала б, што цётачка едзе ў нейкі храм, дзе яна прыслужвае як актыўная прыхаджанка. Прынамсі, у яе такі выгляд. Але з кантралёрамі яна ніколі не спрачаецца. Зацята маўчыць і не рэагуе на іх патрабаванні. Не раз даводзілася быць сведкай, як спагадлівыя пасажыры прабівалі за яе талон і тым самым гасілі канфлікт. Але ж паспачуваць сталаму чалавеку можна раз, другі. А тут яўна праглядаецца пазіцыя: маўляў, плаціць за праезд не буду ні пад якім выглядам. Нядаўна адна кабета, яшчэ маладзейшая за гэтую, ганарліва распавядала ледзь не на ўвесь тралейбус: «А я ніколі не плачу за праезд. Ну, можа, раз здзерлі штраф, а ў асноўным выкручваюся».

СТАР. 6

## СІСТЭМУ АПЛАТЫ ПРАЦЫ БЮДЖЭТНІКАЎ ЧАКАЕ РЭФАРМАВАННЕ

### Правы кіраўнікоў дзяржарганізацый рэгуляваць выплаты будуць пашыраны, а карэктуючыя каэфіцыенты адменены

**Зарплата — тэма, якая цікавіць кожнага. Як вылічваецца аклад і як ён фарміруецца? Як вызначаюцца даплаты за сумяшчэнне прафесій? Што чуваць наконт галіновай сістэмы аплаты працы?**

На гэтыя і іншыя пытанні можна было атрымаць адказы падчас анлайн-канферэнцыі на сайтах Мінпрацы і сацыяльнай абароны і БЕЛТА, якая прайшла ўчора і была прысвечана пытанням аплаты працы ў бюджэтнай сферы. У анлайн-канферэнцыі прынялі ўдзел **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр ГРУШНІК** і спецыялісты галоўнага ўпраўлення працы і заработнай платы міністэрства.

Як заявіў у ходзе анлайн-канферэнцыі Пётр Грушнік, дзейная сістэма аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы складаная і наспела неабходнасць яе спрашчэння. Яе рэфармаванне, прадугледжваецца ў рамках выканання Плана сумесных дзеянняў Саўміна і Нацбанка па структурным рэфармаванні і павышэнні канкурэнтаздольнасці эканомікі Беларусі, зацверджанага пастановай Урада і Нацбанка ад 10 кастрычніка 2013 года № 895/15.

СТАР. 2

■ Надвор'е

## Слота і моцны вецер

**На выхадныя тэмпературны фон будзе на 5–8 градусаў вышэйшым за норму.**

Чарговы атмасферны фронт з боку Польшчы прынясе да нас кароткачасовыя ападкі (мокры снег і дождж) у суботу, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава. У асобных раёнах узмоцніцца вецер парывамі да 15–18 м/с. Зноў будзе галалёд, туман і галалёдзіца на дарогах. Тэмпература паветра ўначы на суботу ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 1 да плюс 4. Вільготнае паветра з боку Балтыйскага мора завітае на тэрыторыю Беларусі ў нядзелю. Месцамі будзе ісці мокры снег і дождж, амаль паўсюдна — галалёдныя з'явы. Уначы чакаецца ад мінус 3 да плюс 2, удзень — мінус 2 да 4 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, і ў пачатку наступнага тыдня ў нас захаваецца паступленне цёплага і вільготнага паветра з Атлантыкі. Месцамі чакаецца дождж і мокры снег. На працягу сутак галалёд і месцамі галалёдзіца на дарогах. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак ад 3 цяпла да 3 марозу, а ўдзень — 0 — плюс 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ГЛАБАЛЬНЫ РОСТ СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ Ў 2014 ГОДЗЕ СКЛАДЗЕ 3%

У бліжэйшыя два гады чакаецца захаванне росту сусветнай эканомікі. Аднак сітуацыя ў банкаўскай сістэме не такая бязвоблачная і тоіць у сабе сур'ёзныя пагрозы сусветнай фінансавай стабільнасці. Пра гэта гаворыцца ў новай справаздачы Дэпартамента ААН па эканамічным і сацыяльным развіцці і Канферэнцыі ААН па гандлі і развіцці. Глабальны эканамічны рост ў 2014 годзе складзе 3%, а ў 2015 годзе — 3,3%. Сёлета рост склаў крыху больш за 2%.

### АБАМЕ РЭКАМЕНДАВАЛІ ЗНІЗІЦЬ МАШТАБЫ ІНТЭРНЭТ-ШПІЯНАЖУ

Экспертная камісія, якая займалася расследаваннем дзейнасці Агенцтва нацыянальнай бяспекі ЗША, рэкамендавала амерыканскім уладам адмовіцца ад праграм па масавым зборы і захоўванні персанальнай інфармацыі інтэрнэт-карыстальнікаў. Поўны тэкст падрыхтаванага камісіяй даклада апублікаваны на сайце Белага дома. Як адзначаецца ў дакуменце, урад не павінен валодаць паўнамоцтвамі па сачэнні за сваімі грамадзянамі і выкарыстанні іх асабістай інфармацыі ў разведвальных мэтах. Усе ўжо існуючыя праграмы ў гэтай галіне, на думку экспертаў, павінны быць «прывязаны да канкрэтных інтарэсаў улад» і не могуць насіць масавага характару.

### КУРЭННЕ ПРАВАКУЕ ЗМЕНЫ Ў ШЭРАГУ ГЕНАЎ

Такім чынам павышаецца рызыка раку і дыябету, паказала новае даследаванне супрацоўнікаў Упсальскага ўніверсітэта і Упсальскага цэнтра клінічных даследаванняў. Характэрна, але сярод гэтых генаў ёсць і тыя, якія важныя для імуннага адказу і якасці спермы, піша The First Post . Эксперты праверылі, як гены мяняліся ў курцоў і людзей, якія не мелі шкоднай звычкі. Была выяўлена вялікая колькасць генаў, якая змяняецца толькі ў курцоў. Трэба сказаць, навукоўцы і да гэтага ведалі, што курэнне павышае рызыку дыябету і шматлікіх тыпаў раку. Таксама ў курцоў аслаблены імунітэт і зніжана якасць спермы. Цяпер зразумела, што адбываецца гэта з-за генных змен.

ISSN 1990 - 763X
13240
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АНТЫГЛАБАЛІСТЫ РАЗВЯЛІ АГОНЬ У ЦЭНТРЫ БРУСЕЛЯ

Тысячы дэманстрантаў заблакіравалі рух аўтатранспарту ў цэнтры Бруселя непадалёк ад месца, дзе пачаў працу саміт Еўрасаюза. Людзі, якія пратэстуюць супраць захадаў жорсткай дзяржаўнай эканоміі, расклалі ў цэнтры бельгійскай сталіцы вогнішчы і палілі на іх мяшкі з сенам. Барыкады ўмацавалі трактарамі,



прыгнанымі ў Брусель фермерамі. Уезд у «еўрапейскі» квартал горада быў цалкам заблакіраваны. Прадстаўнік дэманстрантаў заявіў, што яго паплечнікі патрабуюць, каб Еўропа была для «простых работнікаў і фермераў», а не толькі для прадстаўнікоў эліты. Акрамя таго, пратэстанты дамагаюцца, каб ЕС не заключаў дагавора аб свабодным гандлі з ЗША. Як чакаецца, у ходзе саміту лідары краін ЕС абмяркуюць шырокае кола пытанняў — ад банкаўскай сферы і абароннай палітыкі да адносін з Украінай і становішча ў Цэнтральна-Афрыканскай рэспубліцы.

КОРАТКА

Аб'ём валавога ўнутранага прадукту Беларусі ў студзені-лістападзе бягучага года павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 0,9 працэнта да Br557 трлн.

У суботу, 21 снежня, РУП «Белсаюздрук» правядзе ў крамах і павільёнах сталіцы акцыю: у гандлёвых аб'ектах прадпрыемства рэалізацыя асобных відаў тавараў будзе весціся са зніжкай 15 працэнтаў ад рознічных цэн.

Дасягнута дамоўленасць аб продажы пакета акцый ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў» расійскаму інвестару.

У Мінску з 16 снежня бягучага года па 10 сакавіка 2014-га праходзіць акцыя ў дапамогу асобам без пэўнага месца жыхарства «Сацыяльны патруль». У кожным раёне сталіцы арганізаваны пункты аказання юрыдычных, псіхалагічных і сацыяльна-гігіенічных паслуг.

На канькабежным стадыёне «Мінск-Арэны» 21 і 22 снежня пройдзе чарговы чэмпіянат Беларусі па фігурным катанні.

## ЯК ВЫ АДЧУВАЕЦЕ СВАЮ СУВЯЗЬ СА СВЯЦІЦЕЛЕМ МІКАЛАЕМ?

19 снежня — дзень святога Міколы Цудатворца.



**Мікалай ШКЛЯРАЎ, член Беларускага саюза мастакоў і Беларускага саюза дызайнераў:**

— Я нарадзіўся на Мікалая веснавога, а ў нашай сям'і называлі толькі па святцах. Абраз Міколы быў самы распаўсюджаны ў любым веткаўскім доме, бо вядома, што ён вандроўнікам дапамагае. А стараверы-веткаўчане, да якіх адносілася і мая сям'я, часта ездзілі на заробкі ў іншыя мясціны. Таму і маліліся заўсёды Міколу — каб мужчыны вярталіся дадому. У калекцыі майго бацькі Фёдара Шклярава было не менш за два дзясяткі абразоў менавіта святога Мікалая — але ж яны такія розныя ўсе! Таму, што такіх выяў было многа, калекцыянеры іх на той час не вельмі цанілі. А мне яны вельмі падабаліся. Самы каштоўны абраз, які мы з бацькам прывезлі з адной з вёсак Веткаўскага раёна, цяпер упрыгожвае экспазіцыю Веткаўскага музея. Сваіх сыноў я называў таксама па святцах.



**Мікалай ЛЫСЕНКА, вядучы спецыяліст Гомельскага абласнога савета ДТСААФ:**

— Не ведаю дакладна, чаму мяне назвалі Мікалаем. Маё імя азначае «пераможца народаў». Паколькі я нарадзіўся ў Казахстане, мне здаецца, для маіх славянскіх бацькоў, якія прыехалі туды падымаць цаліну, маё імя было важным напамінам пра радзіму. Кожнае імя, відаць, мае пэўную энергетыку. І, як усе словы маюць матэрыяльнае ўвасабленне, так і імя. Калі я стаў дарослым, мне стала цікава вывучаць Біблію — якраз у тыя часіны, калі быў камуністам і кіраўніком моладзевай арганізацыі. Мне было цікава зразумець канкрэтныя біблейскія матывы, напрыклад, на палотнах славутых мастакоў. Тады ж і пазнаёміўся з гісторыяй пра святога Мікалая. Калі было вельмі цяжка, мне даводзілася звяртацца да вышэйшых сіл і шукаць духоўнай абароны. Але ж у Бібліі гаворыцца: калі ты молішся, трэба зачыніць за сабой дзверы. Таму тут нельга многа напаказ выстаўляць.



**Іераманах Мікалай (ТАРАСЕНКА), насельнік Свята-Мікольскага мужчынскага манастыра ў Гомелі:**

— Мяне ў хрышчэнні назвалі Аляксандрам, а вось тады, калі я даваў манаскія абяцанні, па традыцыі далі новае імя — Мікалай. Пострыг мой адбываўся ў Мікольскім манастыры, у Мікольскай царкве, і ў манастыр я прыйшоў у дзень святога Міколы. Асоба гэтага чалавека, безумоўна, на мяне значна паўплывала. Былі сітуацыі, калі я самым непасрэдным чынам адчуваў дапамогу свяціцеля Мікалая. Я не магу гэта ніяк даказаць — але для мяне асабіста гэта вельмі важна. Звычайна, тыя, хто вандруе, звяртаюцца да яго. У народзе існуе ўпэўненасць, што Мікола-цудатворац усім як сябар і брат — дапаможа любому, не патрабуючы ніякіх асаблівых подзвігаў. Таму, відаць, гэты святы, які быў родам з Блізкага Усхода, успрымаецца і намі, і Заходнім светам як свой. І Санта-Клаус — адно з увасабленняў святога Міколы. Такое шанаванне гэтага чалавека звязана з тым, што ён быў вельмі міласэрным. У нашым манастыры мы вельмі добра ведаем пра жыццё гэтага святога і пастаянна яму молімся.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Віншаванне абаронцам нацыянальных інтарэсаў краіны

***Кіраўніцтву, асабоваму складу, ветэранам органаў дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь***

Паважаныя таварышы!

Віншую вас з прафесійным святам — Днём супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі.

З моманту стварэння беларускай спецслужбы яна штодзень вырашае адказныя задачы па абароне нацыянальных інтарэсаў краіны ад знешніх і ўнутраных пагроз, забеспячэнні яе суверэнітэту і сацыяльна-палітычнай стабільнасці ў грамадстве. Гэта работа патрабуе вялікага прафесіяналізму, мэтанакіраванасці і мужнасці, што ў поўнай меры ўласціва цяперашняму пакаленню чэкістаў.

Самыя цёплыя віншаванні супрацоўнікам ваеннай контрразведкі, якая гэтымі днямі адзначае сваё 95-годдзе, а таксама ветэранам органаў дзяржаўнай бяспекі, чый жыццёвы шлях з'яўляецца прыкладам самаадданага служэння Айчыне.

Упэўнены, што і ў далейшым вы будзеце аддана і з гонарам выконваць свой службовы абавязак.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту, плённай працы ў імя працвітання Беларусі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

■ Грошы

## Насельніцтва трымае ў Беларусбанку $3 млрд у валюце

**Падведзены вынікі дзейнасці найбуйнейшага банка краіны за 11 месяцаў года, паведамілі ў прэс-службе Беларусбанка.**

Спецыялістамі было падлічана, што па стане на пачатак снежня сродкі фізічных асоб у гэтым банку (без уліку налічаных працэнтаў і каштоўных папер) складаюць 48 трлн рублёў, у тым ліку 18,5 трлн рублёў у беларускіх рублях і ў замежнай валюце — 3 млрд долараў у эквіваленце. Праз механізм аблігацый для фізічных асоб банкам прыцягнута 1,6 трлн рублёў, у тым ліку 20 млрд рублёў, 139 млн долараў і 22 млн еўра.

Цяпер у абарачэнні знаходзіцца больш за 5 млн плацежных картак Беларусбанка, а доля безнаяўных аперацый па іх у агульным аб'ёме расходных аперацый з выкарыстаннем плацежных картак у сетцы банка за мінулы месяц склала 27,94%.

За студзень—лістапад аб'ём валютна-абменных аперацый з удзелам фізічных асоб з наяўнай замежнай валютай склаў (з улікам канверсіі) у эквіваленце долараў ЗША па куплі — 2 143,1 млн, па продажы — 2 062,4 млн.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

# У САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ ЎХВАЛІЛІ АБ'ЯДНАННЕ СУДОЎ

**Верхняя палата беларускага парламента напярэдадні закрыцця трэцяй сесіі разгледзела больш за 30 законапраектаў, а таксама Дэкрэт Прэзідэнта № 6 «Аб удасканаленні судовай сістэмы Рэспублікі Беларусь», прысвечаны судовай рэформе ў краіне.**

### Гаспадарчыя суды стануць эканамічнымі

У адпаведнасці з гэтым дэкрэтам з 1 студзеня 2014 года ў Беларусі ствараецца адзіная сістэма судоў агульнай юрысдыкцыі, у якую ўвойдуць і агульныя, і гаспадарчыя суды. Узначаліць аб'яднаную сістэму Вярхоўны Суд, які стане вышэйшым судовым органам, адзіным органам у краіне па грамадзянскіх, крымінальных, адміністрацыйных і эканамічных справах.

У мэтах забеспячэння пераемнасці і недапушчэння зніжэння эфектыўнасці гаспадарчага правасуддзя, захоўваюцца ў якасці спецыялізаваных судоў гаспадарчыя суды абласцей і горада Мінска. Дэкрэтам прапануецца толькі перайменаваць іх у «эканамічныя».

У Вярхоўным Судзе ствараюцца спецыялізаваная калегія па эканамічных справах, узначальваць якую будзе намеснік старшыні Вярхоўнага Суда.

— Такое аб'яднанне прадыктавана жыццём. Гэта спосаб рашэння даўно ўжо наспелага пытання па павышэнні ў цэлым якасці і аператыўнасці правасуддзя ў нашай краіне і лагічны працяг агульнай прававой рэформы, якая адбываецца ў нашай краіне, — сказаў, прадстаўляючы дакумент сенатарам, **старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Валянцін СУКАЛА.** — На працягу шэрагу гадоў у Беларусі існавалі адначасова дзве фактычна самастойныя сістэмы судоў, заснаваныя на адных і тых жа канстытуцыйных прынцыпах ажыццяўлення правасуддзя, якія выконвалі агульныя задачы, але мелі розныя судовыя працэдуры, розныя мадэлі судовага адміністравання і забеспячэння і розныя спосабы выкання судовых рашэнняў.

Старшыня Вярхоўнага Суда адзначыў, што па шляху шырокага развіцця спецыялізаваных судоў, але ў рамках адзінай судовай сістэмы, з адзіным вышэйшым судовым органам, які каардынуе і накіроўвае судовую практыку і палітыку, ідзе абсалютная большасць краін постсавецкай прасторы і Мытнага саюза.

— Рэалізацыя палажэння дэкрэта будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці і якасці ажыццяўлення правасуддзя, ліквідуе супярэчнасці ў правапрымяняльнай практыцы, а таксама спросціць допуск да правасуддзя для грамадзян і арганізацый, — лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Лілія МАРОЗ.**

### Натарыус пацвердзіць перапіску

Савет Рэспублікі таксама прагаласаваў за чарговае наданне натарыусам дадатковых паўнамоцтваў, на гэты раз — па забеспячэнні пісьмовых доказаў.

— Зараз адбываецца рэфармаванне натарыяту з мэтай зрабіць натарыяльныя паслугі больш даступнымі і больш якаснымі, — пракаментавала журналістам праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях натарыяльнай дзейнасці» Лілія Мароз. — З 1 студзеня 2014 года дзяржаўныя натарыусы губляюць статус дзяржаўных служачых, яны пераходзяць на самафінансаванне і самаакупнасць. Гэта значыць, іх заробак цяпер будзе залежыць ад колькасці наведвальнікаў. Законапраект звязаны з чарговым пашырэннем натарыяльных паслуг. Апошнім часам натарыус з бюракрата перарос у прававую фігуру, якая аказвае юрыдычную дапамогу насельніцтву, абараняе яго правы і законныя інтарэсы. Натарыусы ўжо могуць здзяйсняць выканаўчыя надпісы, прысутнічаць на пасяджэннях заснавальнікаў для дакладнай фіксацыі прынятых рашэнняў. Цяпер мы будзем разглядаць новы спектр натарыяльных паслуг: натарыус зможа забяспечваць пісьменны доказ.

Цяпер чалавек, які лічыць, што яго пісьмовы доказ можа быць пазней знішчаны, або прад'явіць яго ў судзе будзе цяжка, зможа звярнуцца да натарыуса, які складзе пратакол з апісаннем гэтага доказу. Пісьмовымі доказамі могуць быць не толькі папяровыя дакументы, але і агульнадаступная інфармацыя, якая маецца ў інтэрнэце. Натарыус можа забяспечыць пісьмовы доказ у выглядзе зместу старонкі сайта.

Для натарыяльнага забеспячэння пісьмовага доказу неабходны дзве абавязковыя ўмовы — зварот да натарыуса павінен адбыцца да пачатку разгляду справы ў судзе, а інфармацыя, якую чалавек жадае зацвердзіць, павінна быць альбо ў агульным доступе, альбо прадстаўлена ім добраахвотна.

### За 50 дзён да алімпіяды

Неабходнай прыступкай да прыняцця Спартыўнага кодэкса павінен стаць разгледжаны ўчора ў Савеце Рэспублікі праект Закона «Аб фізічнай культуры і спорце».

— Сімвалічна, што мы разглядаем гэты законапраект за 50 дзён да адкрыцця Алімпіяды ў Сочы, — заўважыў **Аляксандр КУРЛОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.** — Самае важнае ў гэтым дакуменце тое, што ён распрацаваны з улікам практыкі. Дакумент зацвярджае стандарт спартыўнай падрыхтоўкі спартсменаў высокага класа. Другая важная навацыя датычыцца допінгу ў спорце, яго папярэджання і барацьбы з ім. Шмат увагі праект надае ўзаемадзеянню паміж спартыўнымі арганізацыямі, выкананню абавязацельстваў і захаванню правоў спартсменаў і трэнераў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# СІСТЭМУ АПЛАТЫ ПРАЦЫ БЮДЖЭТНІКАЎ ЧАКАЕ РЭФАРМАВАННЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Сёння заработная плата работнікаў бюджэтных арганізацый рэгулюецца цэнтралізавана. Гэта значыць, што памеры сродкаў, якія накіроўваюцца на выплаты стымулявальнага характару і матэрыяльную дапамогу, вызначаны Прэзідэнтам; тарыфікацыя ажыццяўляецца па Адзінай тарыфнай сетцы работнікаў; памер тарыфнай стаўкі першага разраду вызначаецца ўрадам; умовы аплаты працы бюджэтнікаў, у тым ліку і галіновыя асаблівасці, вызначаюцца нарматыўнымі прававымі актамі Мінпрацы і сацабароны.

У ходзе рэфармавання сістэмы аплаты працы бюджэтнікаў плануецца захаваць цэнтралізаванае рэгуляванне ў дачыненні да тарыфнай часткі заработнай платы і ўмоў аплаты працы, агульных для ўсіх галін бюджэтнай сферы.

Што датычыцца выплат стымулявальнага і кампенсавальнага характару і іншых умоў, звязаных з галіновымі асаблівасцямі (надтарыфная частка заработнай платы), то мяркуецца, што іх рэгуляванне будзе ажыццяўляцца на галіновым і рэгіянальным узроўні.

У ходзе рэфармавання заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы мяркуецца перайсці ад цэнтралізаванага рэгулявання да спалучэння цэнтралізаванага і галіновага (рэгіянальнага) рэгулявання ўмоў аплаты працы пры гэтым пашырыць правы кіраўнікоў дзяржорганаў і арганізацый адносна вызначэння парадку, умоў і памераў выплат, якія залежаць ад галіновай спецыфікі і асаблівасцяў працы; удасканаліць Адзіную тарыфную сетку; адмяніць карэктуючыя каэфіцыенты да тарыфных ставак (акладаў); аптымізаваць структуру заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый.

**Паводле звестак Белстата, колькасць бюджэтнікаў за кастрычнік 2013 года склала 854,5 тыс. чалавек, ці 27,5% ад колькасці работнікаў па рэспубліцы.**

Апрабацыя галіновай сістэмы аплаты працы, па словах першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, праводзіцца Міністэрствам адукацыі з 1 верасня гэтага года ў якасці эксперымента па ўдасканаленні сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў.

Сістэма прадугледжвае залежнасць узроўню аплаты працы педагагічных работнікаў ад якасці і вынікаў іх працы. Пры гэтым улічваюцца галіновыя асаблівасці, інтэнсіўнасць працы педагагічных работнікаў шляхам устанаўлення галіновых выплат за ажыццяўленне выхаваўчай і арганізацыйнай працы, выкладанне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні, праца з адоранымі навучэнцамі, удзел у эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі і іншае. Пры гэтым значна спрашчаецца налічэнне заработнай платы.

**У Беларусі сёння заработная плата бюджэтнікаў рэгулюецца цэнтралізавана (з дапамогай Адзінай тарыфнай сеткі, тарыфнай стаўкі першага разраду, якая зацвярджаецца ўрадам, і карэктуючых каэфіцыентаў).**

Апрабацыя галіновай сістэмы аплаты працы ажыццяўляецца ў 5 сярэдніх школах г. Мінска.

Паколькі гэты эксперымент не завершаны і будзе праводзіцца да 31 жніўня 2014 года, казаць пра яго вынікі яшчэ рана. Пры гэтым Міністэрства адукацыі штомесяц праводзіць маніторынг школ, якія ўдзельнічаюць у правядзенні эксперымента.

Атрыманыя вынікі апрабацыі галіновай сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў мяркуецца выкарыстаць пры рэфармаванні сістэмы аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і ў першую чаргу — для сферы адукацыі.

**Святлана БУСЬКО.**

### ПЫТАННЕ-АДКАЗ

**Ці будзе павышацца тарыфная стаўка першага разраду з 1 студзеня 2014 года?**

Як заявіў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны, у 2014 годзе павышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду будзе праводзіцца, зыходзячы з фінансавых магчымасцяў рэспубліканскага бюджэту з улікам сітуацыі, якая складваецца ў эканоміцы. Цяпер гэтае пытанне прапрацоўваецца з адпаведнымі дзяржаўнымі органамі.

**Ці разглядаецца верагоднасць адмены кантрактнай формы найму ў бюджэтнай сферы?**

Зараз, па словах Пятра Грушніка, гэтае пытанне не разглядаецца. Аднак ён адзначае, што ў сусветнай практыцы кантрактная форма найму работнікаў з'яўляецца найбольш распаўсюджанай.

**Чым тлумачыцца такая істотная розніца ў сярэдняй зарплаце работнікаў розных галін бюджэтнай сферы? Напрыклад, у работнікаў аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння?**

Як заявіў Пётр Грушнік, адказваючы на гэта пытанне, узровень заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый залежыць не толькі ад памеру тарыфнай стаўкі (акладу), але і ад іншых фактараў. Напрыклад, удзельнай вагі высокакваліфікаваных работнікаў у агульнай колькасці, даходу ад пазабюджэтнай дзейнасці арганізацыі, структуры заработнай платы работнікаў і іншых фактараў.

Паводле статыстычных звестак, сярэднямесячная заработная плата работнікаў у сферы аховы здароўя склала ў кастрычніку 2013 года 3943,8 тыс. рублёў, у сферы сацыяльных паслуг — 3089,1 тыс. рублёў.

Больш высокі ўзровень сярэдняй зарплаты ў сферы аховы здароўя ў параўнанні з узроўнем сярэдняй зарплаты работнікаў у сферы сацыяльных паслуг абумоўлены тым, што ў сферы аховы здароўя доля высокакваліфікаваных работнікаў значна вышэйшая, чым у сферы сацыяльных паслуг, а таксама больш магчымасцяў для аказання платных паслуг.

У сферы прадастаўлення сацыяльных паслуг большасць сацыяльных работнікаў не маюць вышэйшай адукацыі, узровень іх тарыфікацыі невысокі (2–5 разрады). Каля 5,2% ад агульнай колькасці работнікаў гэтай сферы — людзі, якія працуюць на ўмовах сумяшчальніцтва, гэта значыць, адпрацоўваюць за тыдзень не 40 гадзін, а 20, адпаведна, і заработная плата ім налічваецца за 20 гадзін.

**Наколькі зарплата жанчын у бюджэтнай сферы ніжэйшая, чым зарплата мужчын? Чым гэта тлумачыцца?**

Паводле статыстыкі, па стане на снежань 2012 года суадносіны намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы жанчын да заработнай платы мужчын у бюджэтнай сферы складалі каля 83%. Розны ўзровень заработнай платы тлумачыцца ўмовамі і рэжымам працы, характэрнымі для асобных пасад (прафесій), спецыфічнымі абавязкамі (у сістэме аховы здароўя — няні, санітаркі і г. д.), узроўнем укамплектаванасці кіруючых пасад мужчынамі і жанчынамі, іншымі фактарамі.



# ЧЫГУНАЧНЫЯ СКРЭПЫ ЕЎРАЗІІ

Адным з актуальных праектаў, які мог бы забяспечыцьператварэнне еўразійскай інтэграцыі ў сапраўдны механізм сумеснага развіцця краін-удзельніц, з'яўляецца праект стварэння Аб'яднанай транспартна-лагістычнай кампаніі (АТЛК) Беларусі, Расіі і Казахстана. Яго рэалізацыя можа павялічыць прыбыткі ўсіх нацыянальных чыгуначных перавозчыкаў трох краін у некалькі разоў, а таксама даць імпульс развіццю транспартна-лагістычнай сферы не толькі краін — удзельніц МС, але і ўсёй Еўразіі ў цэлым. Паводле самых сціплых ацэнак, тавараабарот паміж дзяржавамі Азіі і Еўропы ў бліжэйшыя некалькі гадоў будзе расці штогод у сярэднім на 2–3 працэнты. У 2020 годзе ён дасягне 240 мільёнаў тон у фізічным вымярэнні, што складзе 1,8 трыльёна долараў ЗША ў грашовым выражэнні. Уклад у ВУП краін «мытнай тройкі» да 2020 года можа скласці 11,3 млрд долараў, прычым для Расіі — амаль 5 млрд долараў, для Казахстана — 5,3 млрд долараў, для Беларусі — каля аднаго мільярда.

У гэтай сувязі ў дзяржаў будучага Еўразійскага эканамічнага саюза з'яўляецца магчымасць ператварыцца ў трывалае транспартна-лагістычныя звяно, якое можа «сшчапіць» еўрапейскі і азіяцкі арэалы эканамічнага развіцця і сканцэнтраваць такім чынам у сабе значны паток грузаперавозак.

### АД БРЭСТА ДА ДАСТЫКА

Сёння ўсе постсавецкія краіны мадэрнізуюць сваю транспартную інфраструктуру. Напрыклад, Казахстан пастаянна павялічвае аб'ём інвестыцый у развіццё чыгуначнага транспарту. За апошнія гады была пракладзена другая чыгунка з Кітая прапускной здольнасцю ў 25 мільёнаў тон. Кошт 293-кіламетровага адрэзка ад Жэтыгена да Каргаса на кітайскай мяжы склаў больш за 1 млрд долараў ЗША. Гэты шлях стаў часткай магістралі, якая працягнулася на 10800 кіламетраў з кітайскага Чунцыня ў нямецкі Дуйсбург. Казахстан мае намер укласці сёлета ў развіццё чыгункі яшчэ 1,3 млрд долараў ЗША.

З мэтай павелічэння груза-і пасажырапатокаў з краін Заходняй Еўропы праз тэрыторыю Беларусі, Расіі, Казахстана ў краіны Паўднёва-Усходняй Азіі, Кітая і Персідскага заліва і назад было вырашана стварыць Аб'яднаную транспартна-лагістычную кампанію (АТЛК) Беларусі, Расіі і Казахстана.

Плануецца, што «Расійскія чыгункі» ўнясуць у сумеснае прадпрыемства свае 50 адсоткаў плюс дзве акцыі «Транскантэйнер» і 100-працэнтны пакет акцый ААТ «РЖД-Лагістыка». АТ «Казахстан темір жолы» ўнясе актывы АТ «Казтранссэрвіс» і «Кедэнтранссэрвіс», а беларускі бок, у сваю чаргу, можа даць каля 3 тысяч фітынгавых платформаў. Акрамя таго, плануецца, што ўсе ўдзельнікі здзелкі перададуць АТЛК вагоны для перавозкі кантэйнераў, самі кантэйнеры і неабходную для дзейнасці маёмасць грузавых чыгуначных тэрміналаў на станцыях Забайкальск (Расія), Дастык (Казахстан), Алтынколь (Казахстан), Брэст-Паўночны (Беларусь).

Стварэнне АТЛК дасць магчымасць стварыць грузаадпраўцелям максімальна зручныя ўмовы, пры якіх ім больш не давядзецца дамаўляцца з Казахстанам, Расіяй і Беларуссю паасобку. Грузаадпраўцелям будуць прадастаўляцца адзіныя тарыфныя і нетарыфныя ўмовы на працягу ўсяго шляху ад памежнага пераходу на казахстанска-кітайскай мяжы «Дастык» да «Брэста».

### НАСТУПНЫ КРОК — НОВЫ ВЯЛІКІ ШАЎКОВЫ ШЛЯХ

Відавочна, што ўсе чатыры асноўныя эканамічныя дзяржавы еўразійскага кантынента (ЕС, Расія, Кітай і Індыя) вельмі зацікаўлены ў развіцці транспартных сувязяў у рэгіёне. Еўрасаюз сёння стварае транспартны калідор ТРАСЕКА, які праходзіць праз новыя краіны — члены ЕС у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ва Украіну, на Каўказ і далей — у Цэнтральную Азію, але не ахоплівае Расію. На другім баку кантынента, у Азіі, імкліва развіваецца «Трансазіяцкая чыгунка». Азіяцкі банк развіцця актыўна ўдзельнічае ў стварэнні калідораў, якія ідуць праз Цэнтральную Азію ў рамках праграмы ЦАРЭС.

Сёння каардынацыя паміж гэтымі праектамі практычна цалкам адсутнічае. Напрыклад, Расія не ўдзельнічае ў праектах ЦАРЭС і ТРАСЕКА. Аналагічна стварэнне агульнаеўрапейскіх калідораў не адпавядае праекту «Трансазіяцкай чыгункі».

Пэўная спроба каардынацыі транспартных праектаў была зроблена Кітаем, які сфармуляваў праект Новага Вялікага Шаўковага шляху — стварэння высакахуткасных чыгунак, якія злучаюць Кітай з Еўропай, дзякуючы якому дарога з Лондана ў Пекін будзе займаць усяго толькі два тыдні. Выкарыстоўваючы сетку сваіх унутраных чыгунак у якасці адпраўной кропкі, Кітай плануе пабудаваць новыя чыгуначныя лініі ў паўднёвым напрамку (Сінгапур), у паўночна-заходнім напрамку (Сібір) і ў заходнім напрамку (Індыя, Казахстан і Турцыя), хуткасць на якіх будзе дасягаць 380 км/г.



На думку экспертаў, адзіная дарожная сетка ад Ціхага акіяна да Балтыкі дазволіць ліквідаваць гандлёвыя бар'еры, скараціць тэрміны дастаўкі грузаў і павялічыць узаемаразлікі ў нацыянальных валютах. Такі праект дасць магчымасць мінімізаваць транспартныя выдаткі, паколькі Новы Вялікі Шаўковы шлях прыкладна на траціну карацейшы за марскі шлях, які абгінае Азію і Аравійскі паўвостраў.

У выніку рэалізацыі гэтага праекта тэрміны дастаўкі грузаў з Кітая будуць значна скарочаны. Калі зараз тавары ў Еўропу па моры ідуць 45 сутак, па Транссібе — каля двух тыдняў, то новы шлях будзе самым кароткім і зойме не больш за 10 сутак.

Праект Новага Вялікага Шаўковага шляху ставіць сур'ёзныя патрабаванні да мадэрнізацыі чыгуначных інфраструктур і сістэм кіравання імі ў Беларусі, Расіі і Казахстане. Менавіта гэта меў на ўвазе Прэзідэнт краіны, праводзячы нараду па пытаннях развіцця транспартна-лагістычнага комплексу Беларусі месяц таму. Кіраўнік дзяржавы ў вельмі жорсткай форме патрабаваў ад урада і губернатараў апераджальнага выканання планаў па пашырэнні лагістычнай інфраструктуры на Беларусі і ўдасканаленні адпаведных мытных і іншых працэдур. А ў Казахстане зусім нядаўна была прынята дзяржаўная праграма развіцця і інтэграцыі інфраструктуры транспартнай сістэмы да 2020 года, якая практычна цалкам будзе сканцэнтравана на раскрыцці транзітнага патэнцыялу краіны шляхам зліцця мясцовай інфраструктуры з расійскай і беларускай. Няздольнасць вырашыць гэтыя мадэрнізацыйныя задачы «выкіне» Еўразійскі эканамічны саюз на перыферыю еўразійскага кантынентальнага гандлю.

**Арсен СІВІЦКІ,
дырэктар Цэнтра стратэгічных
і знешнепалітычных даследаванняў.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### СВЯЦІЦЕЛЬ МІКАЛАЙ ЦУДАТВОРАЦ

**Нацыянальны банк уводзіць у абарачэнне сярэбраную памятную манету «Свяціцель Мікалай Цудатворац. 2013» серыі «Праваслаўныя святыя. 2013» наміналам 500 рублёў.**

Манета ў серабры, пробай сплаву 999, масай 500 г выраблена якасцю «пруф», тыражом да 999 штук. На адным баку манеты — выява макета-рэканструкцыі Спаса-Праабражэнскага храма ў Полацку, а на другім — абраз свяціцеля Мікалая Цудатворца. Манеты адчаканены ў акцыянерным таварыстве «Манетны двор Польшчы».

Выпушчаныя ў абарачэнне манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам Беларусі і прымаюцца па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### БЫЛІ ЕЛКІ — СТАЛІ КВЕТКІ

**Незвычайную акцыю прапанаваў правесці ў Магілёве Цэнтр гарадскіх ініцыятыў. Арганізатары дамовіліся з камунальнікамі, каб пад тыя елкі, якія пасля Новага года пойдуць на звалку, былі адведзены спецыяльныя пляцоўкі. Яны будуць працаваць з 10 па 16 студзеня.**

Як паведаміў каардынатар праекта Аляксандр Лазараў, гэтыя паслясвяточныя дрэўцы будуць вывезены не на палігон бытавых адходаў, як гэта рабілася раней, а перароблены «Магілёўзелянбудам» на дранку. Паліва будзе выкарыстана на абаграванне цяпліц, дзе вырошчваюцца кветкі для ўпрыгожвання гарадскіх вуліц.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### ПЕРАДСВЯТОЧНЫ РАСКЛАД ЧЫГУНКІ: КАЛІ І ЯК?

**Унітарнае прадпрыемства «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі» праінфармавала аб курсіраванні цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа і гарадскіх ліній у перыяд калядных і навагодніх свят.**

На ўчастках Мінск — Маладзечна, Мінск — Орша, Мінск — Баранавічы — Брэст, Мінск — Асіповічы 24 і 31 снежня, 4 студзеня яны будуць хадзіць па раскладзе пятніцы. 25 снежня, а таксама 1–2, 5–7 студзеня — як па нядзелях згодна з дзейным раскладам. Цягнікі гарадскіх ліній Мінск — Рудзенск адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 8.18, са станцыі Рудзенск у 9.25 — адмяняюцца. 3 і 10–11 студзеня паязды будуць курсіраваць як па працоўных днях.

На ўчастках Маладзечна — Гудагай, Маладзечна — Круляўшчызна — Полацк, Маладзечна — Ліда 24, 31 снежня, 3–4, 10–11 студзеня цягнікі будуць хадзіць як па працоўных днях, а 25 снежня, 1–2, 5–7 студзеня — як па выхадных згодна з дзейным раскладам.

На ўчастку Орша — Лепель расклад курсіравання будзе такім: 24–25, 31 снежня, 1–7, 10–11 студзеня — як па працоўных днях. 7 студзеня дадаткова прызначаецца цягнік рэгіянальных ліній эканом-класа Орша — Лепель адпраўленнем са станцыі Орша-Цэнтральная ў 18.41.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ШКОЛЬНІК ДАПАМОГ РАСКРЫЦЬ ЗЛАЧЫНСТВА

**Вучань чацвёртага класа ў Рэчыцы дапамог міліцыі. Алег Шандарчук ішоў з гімназіі на трэніроўку, калі стаў сведкам дзёрзкага злачынства.**

На пенсіянерку сярод белага дня на прыпынку грамадскага транспарту напаў п'яны мужчына. Школьнік пайшоў у міліцыю, дзе не толькі расказаў пра злачынства, але і апісаў прыкметы зладзея. Неўзабаве грамадзяніна затрымалі «па гарачых слядах», але ж хлопчык, падкрэсліваюць у прэс-службе ўпраўлення УУС Гомельскага аблвыканкама, аказаў вялікую дапамогу ў раскрыцці гэтага злачынства. У гімназіі ва ўрачыстых абставінах яму ўручылі ганаровую грамату.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ТВОРЧАЯ «СПРАВАЗДАЧА» МАЛАДЫХ МАСТАКОЎ

**З 20 снежня па 18 студзеня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры « (Кастрычніцкая плошча, 1, Палац Рэспублікі) будзе дзейнічаць Рэспубліканская мастацкая выстава лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.**

На выставе прадстаўлены работы студэнтаў, магістрантаў, маладых педагогаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. Глебава і Мінскай дзяржаўнай гімназіі каледжа мастацтваў.

Усе работы прайшлі строгі адбор экспертна-мастацкай камісіі спецыяльнага фонду. Алеся Скарабагатая, Вольга Мельнік-Малахава, Ганна Конанава і іншыя маладыя мастакі і дызайнеры, адзначаныя ўзнагародамі спецыяльнага фонду, з'яўляюцца ўдзельнікамі многіх рэспубліканскіх і міжнародных выстаў і атрымалі заслужанае прызнанне не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Выстава стане своеасаблівай справаздачнай акцыяй маладога пакалення сучаснай беларускай мастацкай школы.

Працаваць яна будзе штодня, акрамя нядзелі і панядзелка, з 11.00 да 19.00. Уваход свабодны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ЗАТРЫМАНА ДЫРЭКТАР ФАБРЫКІ «СЛОДЫЧ»

**Дырэктар ААТ «Кандытарская фабрыка «Слодыч» затрымана па падазрэнні ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі. Пра гэта БЕЛТА паведаміў афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Мінску Аляксандр Герасімаў.**

Упраўленне расследуе крымінальную справу, якая заведзена Камітэтам дзяржаўнай бяспекі ў дачыненні да службовых асоб аднаго з камерцыйных прадпрыемстваў Мінска па прыкметах злачынства, прадугледжанага ч. 2 арт. 376 Крымінальнага кодэкса Беларусі (учыненне службовай асобай з выкарыстаннем службовых паўнамоцтваў незаконнага вырабу ў мэтах збыту і збыту спецыяльных тэхнічных сродкаў, прызначаных для сакрэтнага атрымання інфармацыі). Выяўлена дачыненне да гэтага злачынства дырэктара фабрыкі «Слодыч». У выніку праверкі, праведзенай пракуратурай Мінска сумесна з упраўленнем па раскрыцці цяжкіх эканамічных злачынстваў ГУУС Мінгарвыканкама і АБЭЗ Партызанскага РУУС, высветлілася, што дырэктар фабрыкі распарадзілася набыць у вышэйназванай фірмы спецыяльнае абсталяванне для падслухоўвання і запісу гуку за кошт прадпрыемства і ўсталяваць яго ў службовых памяшканнях.

Упраўленнем Следчага камітэта па Мінску дзеянні дырэктара фабрыкі «Слодыч» расцэнены як злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі ў асабістых інтарэсах з нанясеннем прадпрыемству шкоды ў асабліва буйным памеры (больш як Br202 млн). Таксама дырэктарам нанесена шкода правам і законным інтарэсам грамадзян шляхам парушэння тайны тэлефонных перамоў і іншых спосабаў зносін з выкарыстоўваннем спецыяльных сродкаў, што парушае дзейнае заканадаўства.

30 января 2013 г. в 13.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элегант».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13.

Время регистрации в день проведения собрания с 12.30 до 13.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 23.12.2013 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества. УНП 400078331

Ксенія ДЗЮКАВА:

ТВ@Р

# «КАБ РАБІЦЬ УСЁ, ЯК ТРЭБА, ВУЧЫЛАСЯ НА ПАМЫЛКАХ ІНШЫХ»



**Жанчына, якая дасягае поспехаў, не можа разлічваць на абыякавасць. Тым больш, калі яна мае талент рэалізаваць сябе не толькі ў кар'еры, але і ў асабістым жыцці. З такіх і Ксенія Дзюкава. Сёння яна працуе вядучай у «Добрай раніцы, Беларусь!» на канале «Беларусь 1», з'яўляецца правай рукой у прадзюсарскім цэнтры свайго мужа Дзмітрыя Фаміча і адчувае сябе цалкам шчаслівай.**

***— З чаго пачалася ваша праца на тэлебачанні?***

— Усё пачалося з кліпа «Фіеста», які мы зрабілі сумесна з групай «Чук і Гек». Я знялася ў ім, і кліп аднеслі на «MTV Мінск», быў тады ў нас такі канал. А там якраз шукалі дзяўчыну на роль вядучай. Многія пабывалі на кастынгу: наколькі я ведаю, адабралі каля тысячы прэтэндэнтак. Але заснавальнік, убачыўшы мяне ў кліпе, сказаў: рабіце што хочаце, але гэтая дзяўчына павінна быць нашай вядучай. Я ж аб прафесіі тэлевядучай для сябе нават не задумвалася ніколі. Сустрэліся з прадзюсарам канала Валікам Грышко на вуліцы, паразмаўлялі некалькі хвілін — і мяне зацвердзілі. Праз два дні ў мяне было першае інтэрв'ю з Філіпам Кірковым. Пасля яго ўсё і закруцілася...Так я стала вядучай рэйтынгвай праграмы «News-BLOCK» і першым віджэем у гісторыі беларускага MTV.

**Вядучы павінен працаваць на тое, каб гледачы атрымлівалі пазітыў.**

***— З якімі пачуццямі працавалі на першых эфірах?***

— Дакладна не было хвалявання і скаванасці, бо перад камерай на той момант я стаяла не ўпершыню. Безумоўна, здараліся сітуацыі, калі я разумела: многаму давядзецца навучыцца. Але ж да таго часу я ўжо не першы год «варылася» ў шоу-бізнесе. З першых дзён у ім — сёння гэта ўжо 13 гадоў — я была менеджарам групы «Чук і Гек». Ездзіла з імі на ўсе інтэрв'ю, здымкі. І менавіта так я асвоіла аснову майстэрства вядучай — ведала, як рабіць нельга. Бо калі прывозіш артыста, то цудоўна разумееш, што ён павінен расказаць тым людзям, якія рыхтуюць з ім інтэрв'ю. Я вучылася на памылках іншых, каб рабіць усё, як трэба, з самага пачатку.

***— Зараз вы працуеце ў праграме «Добрай раніцы, Беларусь!». Адчуваеце рост?***

— Для мяне «Добрай раніцы, Беларусь» — гэта новы этап у працы вядучай. Таму што пасля MTV у мяне былі яшчэ два праекты на БелМузТБ — «Fresh-новости» і «Light TV» — праграмы цікавыя і розныя па сваім змесце, але яны рабіліся ў запісе. А «Добрай раніцы, Беларусь!» выходзіць у прамым эфіры, і ад гэтага я атрымліваю найбольш задавальнення. Тут ад вядучых патрабуецца высокі ўзровень майстэрства. У нашай прафесіі прамы эфір — гэта вышэйшы пілатаж. І, разумеючы, што можаш так працаваць, атрымліваеш ад працэсу радасць: такія пачуцці ні з чым не параўнаць.

***— Як пачынаецца ваш дзень?***

— У мяне часам бывае так, што дзень проста не заканчваецца, а плаўна пераходзіць у працоўную раніцу. Бо я не магу заснуць, калі напярэдадні адбылося нешта, ад чаго ў мяне застаецца шмат эмоцый. А класціся спаць неабходна, тады ты больш сканцэнтраваны на эфіры. Але ўжо як атрымліваецца... Прачынаюся я а трэцяй гадзіне: трэба сабрацца, кавы папіць для бадзёрасці і паехаць на здымачную пляцоўку. Праца пачынаецца ў пяць гадзін раніцы.

***— Перад самім эфірам неяк настройваецеся?***

— У нас ёсць традыцыйны жэст. (*Дэманструе: пляск у далоні, расціранне і здзьмухвае, нібы паветраны пацалунак.* — **Аўт**.) І нам ён прыносіць удачу.

***— Маючы вопыт сольнай працы ў эфіры і ў пары, ці адчуваеце для сябе розніцу?***

— У мяне ёсць адна бяда — тое, што я вельмі эмацыйны чалавек. І, як вынік, часам магу сабой «перакрываць» партнёра. Вельмі камфортна мне было працаваць у тандэме з Ільёй Конанавым. Не магу нават растлумачыць прычыны, але мы настолькі адно аднаго разумелі, што стваралі гарманічнае спалучэнне ў кадры. Нават мае калегі, хто бачыў нашу працу, кажуць пра гэта. І дагэтуль ні ён, ні я не змаглі ні з кім так спрацавацца. У праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» у нас эфірны дуэт з Аляксандрам Паўлавым, аднак наша пара ўтварылася не натуральна. Калі я прыйшла на праграму, ён ужо працаваў там. І нас проста аб'ядналі. Я ўся такая вясёлая дзяўчына, а Саша больш сур'ёзны і спакойны, таму мы іграем на кантрастах. З ім мне вельмі падабаецца працаваць, ад яго я многаму навучылася, што датычыцца працы ў прамым эфіры. Сольна мне таксама добра. Тут, як мне здаецца, галоўнае — калі ты ўмееш працаваць, то незалежна ад таго, адна ты ці з кімсьці перад камерай, вынік будзе аднолькава выдатным. Перад табой ставяць задачу, і ты павінен выканаць яе, а не дыктаваць свае ўмовы, як табе лепш. Вядучы павінен працаваць на тое, каб гледачы атрымлівалі пазітыў.

***— Ад чаго вы атрымліваеце зарад станоўчых эмоцый?***

— Як гэта ні дзіўна, але апошнім часам найбольш задавальнення я ятрымліваю ад сну. Магчыма, гэта навеяна тым, што апошнія месяцы працы вельмі шмат. Але я люблю тое, чым займаюся. Ведаеце, кажуць: «Знайдзі хобі і зрабі яго сваім заняткам па жыцці, тады не давядзецца працаваць ніводнага дня». Кожны дзень на працу я іду як на свята, аднак, безумоўна, бываюць моманты, калі хочацца аднавіць сілы. Такога ж, каб я з жахам думала пра новы дзень, у мяне не бывае.

У мяне ёсць мае любімыя артысты, прасоўваннем якіх я займаюся. І калі ты па крупінках прадумваеш і ствараеш іх вобраз, а потым бачыш іх на сцэне, то адчуваеш пачуццё гонару. Такога не бывае нават у тыя хвіліны, калі сам аказваешся на сцэне. Для мяне найбольшае задавальненне — гэта бачыць плён уласнай працы.

***— Вы не першы год у шоу-бізнесе. Ці ўдалося вывесці нейкую формулу поспеху ў прасоўванні артыстаў?***

— Тут ёсць два варыянты. Першы і прасцейшы — рабіць якасны прадукт, не шкадуючы сіл, грошай і эмоцый. Якасць павінна быць ва ўсім, пачынаючы ад музычнага матэрыялу і заканчваючы падачай сябе. У любым праекце мусіць прысутнічаць ідэя. Калі выпускаеш артыста на сцэну, то трэба разумець, што гэта за чалавек. Такі шлях вам назаве любы прадзюсар. Вынік працы залежыць ужо ад здольнасцяў. Другі варыянт — быць не падобным на ўсіх астатніх. Тут трэба быць гатовым пайсці насуперак усяму, што робяць іншыя. Я прыхільніца больш складаных шляхоў. У нашай краіне, на жаль, аўдыторыя часцей за ўсё не прымае беларускае. Як правіла, пра сваіх мы пачынаем узгадваць тады, калі іх заўважаюць у Расіі альбо ва Украіне. Але прыемна бачыць, што часам усё ж звяртаюць увагу і на айчынны прадукт.

**У мяне часам бывае так, што дзень проста не заканчваецца, а плаўна пераходзіць у працоўную раніцу.**

***— Як ставіцеся да нядобразычлівасці ў свой адрас?***

— Я проста раблю сваю справу і менш за ўсё думаю пра тое, як на маё існаванне нехта рэагуе. Нават сваім артыстам я кажу: трэба быць гатовым да таго, што нехта будзе незадаволены вашымі поспехамі. Гэта нармальная рэакцыя людзей, якія не адбыліся ў жыцці. А ў нас шмат такіх. Варта некаму выбіцца ў лідары — адразу пачуеш дрэнныя водгукі, і яны тлумачацца толькі чалавечай незадаволенасцю ўласным жыццём. Я разумею, што і ў дачыненні да таго, чым я займаюся, можа быць球 рознае стаўленне. Але што ж рабіць — не магу я падабацца ўсім...

**Алена ДРАПКО.**

# «ЗОЛАТА» І «СЕРАБРО» ЮНАЙ БЕЛАРУСКІ



**Віцебская спявачка Віўен Сабі, салістка дзіцячай студыі эстраднай песні «Форум» «Цэнтра культуры «Віцебск», на Міжнародным фестывалі маладых выканаўцаў Riga Symphony 2013 заваявала «золата» і «серабро».**

Сёлета гэтая ж адораная дзяўчынка таксама паспяхова выступіла на конкурсах у Казахстане, Іспаніі.

У сталіцы Латвіі Віўен стала переможцам у намінацыі «Сусветны хіт» і заняла другое месца — у намінацыі «Аўтарская песня». Акрамя беларускіх вакалістаў, у гэтым прэстыжным фестывалі бралі ўдзел канкурсанты з Грузіі, Італіі, Казахстана, Літвы, Расіі, Украіны, Турцыі і іншых краін. А членамі журы былі «зорныя» музыканты і кампазітары з Арменіі, Азербайджана, Балгарыі, Грузіі, Латвіі, Літвы... Ад нашай краіны ў якасці музычнага эксперта быў запрошаны Георгій Калдун.

— Riga Symphony 2013 — гэта не толькі конкурс, але і насычаная культурная і канцэртная праграмы. На працягу пяці дзён госці фестывалю пабывалі на прыёме ў мэрыі горада Рыга, наведвалі майстар-класы вядучых педагогаў па вакале, знаёміліся з латышскай нацыянальнай культурай. Такія сумесныя праекты — выдатны спосаб пазнаёміцца з іншымі нацыянальнымі вакальнымі школамі і паказаць сваю, — паведамілі «Звяздзе» ў «Цэнтры культуры «Віцебск».

Віўен марыць прадставіць Беларусь на дзіцячым конкурсе міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». І ўпэўнена ідзе да сваёй мэты!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «МІР» — НА ДАРОЗЕ

**Напярэдадні навагодніх свят радыё «Мір» сумесна з ДАІ сталіцы арганізавала акцыю, мэтай якой было звярнуць увагу на стасункі вадзіцеляў і пешаходаў.**



На працягу тыдня супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі спынялі кіроўцаў аўто і выказвалі ўдзячнасць тым, хто прытрымліваўся правілаў дарожнага руху. А дыджэі радыёстанцыі ў касцюмах Дзеда Мароза і Снягуркі дарылі падарункі тым, хто прапускаў пешаходаў на пераходзе, які не рэгулюецца.

«У крыві кожнага дыджэя ёсць нешта ад Дзеда Мароза. Для вядучага быць у гэтай ролі — гэта нават больш адказна, чым працаваць у эфіры на радыё. Але агульнае ў іх тое, што радасць дарыць ёсць магчымасць!» — падзяліўся Канстанцін Юманаў. За час правядзення акцыі ў ролі Дзеда Мароза выступілі радыёвядучыя Юрый Цароў і Канстанцін Юманаў, а Каця Пытлева прымерала ролю Снягуркі.

Для вадзіцеляў, якія сталі ўдзельнікамі акцыі, сустрэчы з вядомымі радыёвядучымі былі вельмі нечаканымі. Рэагавалі, трэба заўважыць, па-рознаму: адны бянтэжыліся, іншыя здзіўляліся, а здаралася — сабраўшыся з думкамі ад нечаканасці, пачыналі спяваць песні і расказваць Дзеду Марозу вершы. Пачынаючы ад навагодніх і заканчваючы Аляксандрам Блокам.

Напрыклад, калі на імправізаваным пасту ДАІ спынілі Віталя, мужчына быў шакіраваны. Летась ён неяк ужо трапіў у сітуацыю, калі яго аштрафавалі за тое, што не прапусціў пешахода. І вось цяпер кіроўца стараецца быць уважлівым.

«Вельмі прыемна, калі інспектар ДАІ не штраф табе выпісвае, а выказвае словы падзякі за тое, як ты паводзіш сябе на дарозе», — прызнаўся вадзіцель.

Незалежна ад рэакцыі падарункі ад радыё «Мір» і ДАІ горада атрымлівалі ўсе без выключэння. Падзякі, аднак, гучалі толькі для тых, хто прапускаў пешаходаў. Бо толькі за 2013 год у Мінску адбылося каля 1,5 тысячы дарожна-транспартных здарэнняў на пешаходных пераходах. Такім спосабам у перадсвяточныя дні вадзіцелям чарговы раз нагадалі: трэба быць уважлівымі на дарозе.

«Хочацца пажадаць усім аўтааматарам заставацца ў нашай кампаніі, бо з намі весела. Слухайце радыё «Мір», не парушайце правілаў дарожнага руху, — звярнуўся да ўдзельнікаў і слухачоў вядучы Юрый Цароў. — Не забывайце пра ўзаемную павагу. Здароўя вам, поспехаў і з надыходзячым Новым годам!»

**Алена ДРАПКО.**

## ■ Медыяпрастора

# БЕЗ РЭЦЭПТУ

**Здароўе — гэта самае дарагое, што ёсць у чалавека, і наша задача — захаваць яго на доўгія гады. Штодня ў 10.15 і 15.15 на радыё «Мір» можна пачуць каштоўныя парады па здаровым харчаванні. Як зберагчы сябе ў сезон прастуд, як засцерагчы сваіх блізкіх ад інфекцый, якія прадукты трэба ўключыць у рацыён зімой, каб не захварэць, як не змерзнуць і пазбавіцца ад зімовай дэпрэсіі? На гэтыя і многія іншыя пытанні вы знойдзеце адказы ў праграме «Без рэцэпту» з Кацярынай Карпека.**

А вось пра самае актуальнае, моднае і сучаснае ў свеце музыкі кожны вечар у 20.45 расказвае Кацярына Пытлева. Як з лёгкасцю сачыць за ўсімі музычнымі навінкамі? Як не прапусціць рэліз новага альбома любімага артыста? Хочаце быць у курсе ўсіх культурных навін і падзей сучаснага шоу-бізнесу? Разам з радыё «Мір» гэта вельмі проста! Толькі прэм'еры, «зоркі» і самыя яркія новыя імёны. Будзьце ў курсе таго, што слухае свет! Разам з радыё «Мір»!

МИР

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2014 года!

Шаноўныя сябры!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым калядным падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 | 285 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 | 256 500 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 | 571 800 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 | 514 800 |

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 23 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.30** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00 Меладрама «Палюбоўнік для Люсі».**
**12.10, 14.55, 18.35** Evrovision. Без каментарыяў.
**12.15, 22.55** Лёс гігантаў.
**13.25** Клуб рэдактараў.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.25** Усё як трэба!
**16.50 Камедыя «Моцны шлюб».**
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Сваты-6».**
**0.05** Дзень спорту.
**0.15 Баявік «Пастка».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Я — целаахоўнік».**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45, 23.45 Серыял «Хакейныя гульні». 1-я серыя.**
**12.20** «Імперыя песні».
**12.55 Камедыя «Якія не падаюцца».**
**14.35 Камедыя «Рыкі Бобі: Кароль дарогі».**
**16.40** Беларуская часінка.
**18.55 Серыял «Апостал».**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Інтэрны».**
**22.40 Серыял «Рэальныя хлопцы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 12.25, 18.55, 0.40** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.30, 0.45** «Год у гісторыі».
**8.20** «Свет прыроды». Каля дрэва дружбы трох народаў.
**8.55** «Рэчавы доказ». Мы былі. Дак. фільм.
**9.20** «Росчырк часу».
**9.35 «Трамвай у Парыж». 2-я серыя. Маст. фільм.**
**10.25, 22.25** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.55 «Вясёлая моладзь». Маст. фільм.**
**12.45, 0.10** «Святло далёкай зоркі». Памяці Міхаіла Уладзіміравіча Пятрова.
**13.10, 23.45** «Аўтограф».
**13.45** «Збянтэжаны Саўка». Кароткаметражны фільм.
**14.15** «Палескі пачастунак». Бульба з курыцай.
**14.30** «Карані».
**15.00** «Музеум».
**15.15 «У жніўні 1944-га». Маст. фільм.**
**17.10** «Наперад у мінулае».
**17.40** «Наша спадчына». Палац Валовічаў.
**17.55** «Масква — Мінск. Кінатранзіт». Барыс Плотнікаў. «Узыходжанне». Дак. фільм.
**18.30** «Цуды прыроды».
**19.05 «Дзеці капітана Гранта». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**20.50 «Чалавек з чорнай «Волгі». Маст. фільм.**
**22.50 «Пакуль мы жывыя». Маст. фільм. 1-я серыя.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Суонсі» — «Эвертан».
**9.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Саўтгемптан» — «Тотэнхэм».
**11.50** Хакей. Чэмпіянат свету (U-20). Беларусь — Польшча.
**13.40, 18.20** Біятлон. Ансі. Эстафета.
**15.10** Валейбол. Кубак выклiку. Жанчыны. «Мінчанка» — «Інсбрук» (Аўстрыя).
**16.30** Хакей. Чэмпіянат свету (U-20). Латвія — Беларусь.
**19.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Фулхэм» — «Манчэстэр Сіці».
**21.35** Авертайм.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Арсенал» — «Чэлсі».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Матч».**
**12.10** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здароўечка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Даравраць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Ігнат Дабжынскі. Тайна суперагента».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05 Маст. фільм «Ты сустрэнеш таямнічага незнаёмца».**
**23.55** «Вячэрні Ургант».
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Джэймі: Калядная вечарынка».
**13.00** «Глядзець усім!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг». Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Вялікія тайны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**2015** Дзённік «ХорошШоу».
**20.20 Маст. фільм «Пакрыццё страты».**
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.25 Серыял «Знахар: Паляванне без правіл».**

### МІР

**5.00 Серыял «Таццянін дзень».**
**6.40** «Нястрачаны Пецярбург».
**6.50** М/ф.
**7.10** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**9.10, 0.40 Маст. фільм «Цырк запальвае агні».**
**10.50** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.25, 2.10 Серыял «Клон».**
**14.10, 3.50** Дак. фільм «У сэрцы каменных джунгляў».
**15.20, 22.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Спадчына».**
**18.25** «Беларусь сёння».
**19.00 Серыял «Зорка эпохі».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40** Дак. фільм «Рэальны свет».
**23.00 Маст. фільм «Новыя амазонкі».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «1000 дробязяў».
**15.10** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.55, 18.00 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.50, 20.40 Серыял «Сваты-5».**
**21.45 Серыял «Берагі маёй мары».**
**23.35 Серыял «Тайны следства».**
**0.45** «Трыумф смешнай дзяўчыны. Аліса Фрэйндліх».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Гаруноў».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Серыял «Шахта».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 11.45, 18.55, 20.55, 0.05** «Надвор'е».
**7.05, 14.05 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**8.45, 17.25 Серыял «Касл».**
**10.15 Камедыя «Калядная пяцёрка».**
**11.50 «Сінематограф». Маст. фільм «Гэта цудоўнае жыццё».**
**15.50** Мультпарад.
**16.00** «Мой любімы гадаванец».
**16.30 Серыял «Гімнасткі».**
**19.00 Серыял «Ваенны шпіталь».**
**20.40** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Знаёмцеся, Джо Блэк».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00, 20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».**
**10.00** «Шчасце без ахвяр».
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00, 21.10 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30** «Аўташкола».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00 Серыял «Аднакласнікі».**
**19.30** «Вясёлыя гісторыі з жыцця».
**23.30** «Улётнае відэа».
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.40, 18.30, 22.45** Навіны культуры.
**9.15** «Наглядальнік».
**10.15 «Я крочу па Маскве». Маст. фільм.**
**11.30** Канцэрт, прысвечаны 10-годдзю кампаніі «Расійская чыгунка».
**12.10** Успаміны Сігурда Шміта. «Лінія жыцця».
**13.05** «Юрый Візбар». Дак. фільм.
**13.45, 0.40 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Серыял.**
**14.50** «Балапан — крылы Алтая». Дак. фільм.
**15.50 «Бег інаходца». Маст. фільм.**
**17.05** «Тыя, з якімі я... Сяргей Урусеўскі».
**18.00** «Палацы Раманавых». Дак. серыял.
**18.45** Галоўная роля.
**19.00** «Сацi. Нясумная класіка...».
**19.45** Юбіляры года.
**20.40** «Планета дыназаўраў». Дак. серыял.
**21.30** «Тым часам».
**22.15** «П'едэстал прыгажосці. Гісторыя абутку з Рэнатай Літвінавай». Фільм 1-ы.
**23.05** «Вячэрні вандроўнік». Шаўкат Абдусаламаў. Дак. фільм.
**0.00** «Услых». Паэзія сёння.
**1.35** Л. Бетховен. Саната № 10.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2008 год.
**6.20** «Добры вечар, Масква!». 1991 год.
**7.50** «Музычная карусель». 1994 год.
**9.00 «У знак пратэсту!» Маст. фільм.**
**10.25** «Вось і ты...». Фільм-канцэрт.
**11.00** «Як стаць каханым». 1992 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Блакітны агеньчык».1965 год.
**14.00** «Вясёлыя хлопцы». 1982 год.
**15.20** «Бушуе «Маргарыта». Фільм-канцэрт.
**16.30 «Госць». Кароткаметражны фільм.**
**17.00** «Вясёлыя ноткі. На бале ў Папялушкі». 1991 год.
**18.15** «На кватэры С.Я. Маршака». 1962 год.
**18.40 «Проста жах!». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**19.45** «Старыя добрыя казкі». 1993 год.
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «КВЗ-87». 1-я частка.
**23.05** «А карабель плыве...». 1991 год.
**0.10** Шоу-група «Доктар Ватсан». Папуры.
**0.45 «Моцны мужык». Маст. фільм.**
**4.00** «Кінапанарама». 1990 год. 2-я частка.

### EUROSPORT

**10.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**12.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету ў Маскве.
**12.45, 22.30** Лёгкая атлетыка. Усайн Болт.
**13.00** Скачкі на лыжах. Кубак свету.
**14.00, 19.30** Веласпорт.
**15.00** Горныя лыжы. Пакальны турнір.
**16.25, 22.25** Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па тэнісе. Фінал.
**17.55, 20.25** Тэніс.
**18.00, 22.45, 1.15** Вось гэта дзіва!!!
**18.30** Біятлон. Кубак свету.
**20.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Фінал.
**22.00, 3.00** Футбол. Еўрагалы.
**23.00** Пра рэстлінг.
**0.30** Коннаспартыўны часопіс.
**0.45** Sport Excellence.
**0.50** GTA. Наступны ўзровень.
**1.00** Спартыўны пашпарт.
**1.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**2.55** Спорт і Ко.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 2.20** Серыял «Дваццаць дванаццаць».
**6.15** Камедыя «Яна некіруемая».
**7.45, 20.40, 21.50, 23.50, 1.45** «Камедыянты. Лепшае».
**9.00** Камедыя «Зямныя дзяўчаты лёгка даступныя».
**11.15** Прыгоды «Прывід у законе».
**14.00** Камедыя «Зоймемся каханнем».
**17.20** Камедыя «Спачатку каханне, пасля вяселле».
**19.20** Камедыя «Дагары нагамі».
**21.00** Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
**22.10** Камедыя «Пяшчотныя ручкі».
**0.10** Камедыя «Зноў у гульні».
**3.25** Камедыя «Парода бульдог».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 18.30, 3.25** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.10** «Жонка. Гісторыя кахання». Алена Якаўлева.
**14.30** «Сто пытанняў даросламу». Наталля Белахвосцікава і Уладзімір Навумаў.
**15.15, 0.35, 3.25** Серыял «Звышнатуральнае».
**20.30** Серыял «М.У.Р».
**21.30, 5.05** Серыял «Апошняя сустрэча». Заключная серыя.
**22.40** Маст. фільм «Поўнае зацьменне».
**1.25** Серыял «Быць чалавекам».
**2.30** «Часова даступны». Андрэй Кураеў.

### ТБ1000

**5.00** Баявік «Даміно».
**7.15** Трагікамедыя «Дзверы ў падлозе».
**9.10** Камедыя «Пастка для нявесты».
**11.00** Драма «Блізкасць».
**13.00** Трылер «Ракавы лік 23».
**15.00** Трагікамедыя «Пажыццёва».
**17.00** Меладрама «Спяшайся кахаць».
**18.50** Камедыя «Салодкі лістапад».
**21.00** Камедыя «Сэрцаед».
**22.50** Драма «Дзяўчына ў парку».
**0.45** Жахі «Я ведаю, што вы зрабілі мінулым летам».
**2.25** Драма «Прах Анджэлы».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Прыгоды «Стрэлы Робін Гуда».
**8.00** Камедыя «Ёлкі».
**9.40** Камедыя «All Inclusive, або Ўсё ўключана».
**11.30** Драма «Год сабакі».
**14.00** Камедыя «Скарбы О.К.».
**16.00** Камедыя «Свята пад замком».
**18.00** Камедыя «Дзед Мароз заўсёды звоніць... тройчы!».
**20.00** Мюзікл «Снягурка».
**21.40** Камедыя «Курачка Раба».
**0.00** Драма «Слон».
**2.00** Драма «Поп».
**4.20** Меладрама «Прагулка».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 19.00** Расследаванні авіякатастроф.
**6.00, 16.00** Сесар Мілан: Важак зграі.
**7.00** Вепручыная маці.
**8.00, 13.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**9.00, 14.00** Злавіць сома.
**10.00, 12.00** Гульні розуму.
**11.00** Мяжа.
**15.00** Тайнае логава акул.
**17.00, 2.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**18.00** Пакінутыя.
**18.30** Рабі стаўкі і ўзрывай.
**20.00, 0.00, 3.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 1.00, 4.00** Амерыканская мафія.
**22.00** Тайны гісторыі.
**23.00** Аферысты і турысты.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Паўночная Амерыка.
**7.50** Майстры выжывання.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Шукальнікі скарбаў Амерыкі.
**10.30, 0.00** Як уладкаваны Сусвет.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**12.20, 21.00, 3.05** Пякельныя трасы.
**13.15, 5.10** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.05** Махінатары на трасе.
**15.30** Зброя па-амерыканску.
**18.15** Не спрабуйце паўтарыць.
**19.10** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**22.00** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**23.00** Хлопцы з Юкана.
**0.55** Top Gear.
**1.50** У турме і на чужыне.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

# «Не плаціла і не буду плаціць!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тая ж пазіцыя назіраецца і на інтэрнэт-форумах, калі ідзе абмеркаванне паведамленняў аб чарговым выпадку агрэсіі ў дачыненні да кантралёраў грамадскага транспарту. Нядаўна ўсе сайты пісалі пра нападзенне на кантралёра пенсіянеркі з Баранавічаў. Мяне ўразіла, што абсалютная большасць людзей апраўдвае пенсіянерку. Аказваецца, як шмат у нас спачуваючых тым, у каго малая пенсія, цяжкае жыццё і непасільны цяжар аплаты за праезд у грамадскім транспарце. Ім, каментатарам, няўцям, што за «зайцоў» плацяць усе астатнія добрасумленныя пасажыры. Не з нябеснай жа канцылярыі фінансуецца транспарт канкрэтнага горада. І не варта, можа, было б нават звяртаць увагу на электронных крыкуноў: думаю, ніхто з іх не пайшоў бы хаця б дзень дабрачынна папрацаваць на карысць, напрыклад, тых жа пенсіянераў і іншых малазабяспечаных грамадзян. Не дадае аптымізму той факт, што названыя каментарыі адлюстроўваюць пазіцыю пэўнай часткі грамадства, якая і выліваецца потым у адкрытую агрэсію да работнікаў кантрольнай службы транспарту.

Літаральна ў гэтую нядзелю мае дзеці сталі сведкамі непрыемнага інцыдэнту на вуліцы Луцкай у Брэсце. З аўтобуса №18 на прыпынку выйшаў мужчына і стаў штурхаць кантралёра-жанчыну. У панядзелак раніцай пытаюся пра гэты выпадак у Маргарыты БАНДУРЫ, якая часова выконвае абавязкі начальніка кантрольнай службы «Брэстгартранса».

— Не ведаю, — кажа Маргарыта Ігараўна. — У нас такіх інцыдэнтаў — кожны дзень. Нашы супрацоўнікі дакладваюць аб асабліва прыкрых выпадках, калі даводзіцца выклікаць міліцыю. А калі абышлося без цялесных пашкоджанняў, безбілетнік абмежаваўся абразамі ці мінімальным рукапрыкладствам, то мы ўжо і не ўлічваем гэта як надзвычайнае здарэнне. Выдаткі прафесіі: страчаныя нервы ў справаздачы не адлюструеш.

Маргарыта Бандура расказала, што, згодна са штатам, у кантрольнай службе «Брэстгартранса» павінна працаваць 48 чалавек. Сёння працуе 33. І хоць зарплата ў супрацоўнікаў апошнім часам прыстойная, многія людзі не вытрымліваюць псіхалагічных перагрузаў, звальняюцца. Не кожны вытрывае, калі на яго пастаянна выліваецца паток грубасці, агрэсіі толькі за тое, што ён сумленна выконвае свае абавязкі. Спрабавалі прыцягваць да работы студэнтаў у вячэрні час, але, як правіла, яны праз месяц звальняюцца, не вытрымліваюць.

Два разы на тыдзень Маргарыта Бандура і начальнік службы Яўген Жалтоўскі выязджаюць у рэйды, пераважна ў вячэрні час. «Некалі напішу мемуары, — жартуе Маргарыта Ігараўна. — Зусім як у Газданава «Начныя дарогі». Але цяпер пасля такіх рэйдаў нават не заснеш доўга: занадта адмоўныя ўражанні перапаўняюць.

Што гаварыць, нядаўна да патыліцы жанчыны-кантралёра прыставілі пісталет. Ці сапраўдны, ці муляж — невядома. Потым хуліган хутка ўцёк, міліцыю выклікаць не паспелі. Нідзе гэты факт дакументальна не адлюстраваны, але можна сабе ўявіць, які стрэс перажыла супрацоўніца транспартнай службы.

У адным з нядаўніх рэйдаў кіраўніцтва кантрольнай службы парушальнікаў было столькі, што месца ў машыне не хапала.



**Калі абышлося без цялесных пашкоджанняў, безбілетнік абмежаваўся абразамі ці мінімальным рукапрыкладствам, то мы ўжо і не ўлічваем гэта як надзвычайнае здарэнне.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Проста не паспявалі забіраць у міліцыю ўсіх, хто вызначыўся «добрымі паводзінамі». З апошніх прыкрых выпадкаў можна згадаць нападзенне пасажыра на кантралёра. Аштрафавалі за безбілетны праезд дзяўчыну. І раптам мужчына пачаў яе апраўдваць. Пасля абмену «кампліментамі» ён падскочыў да кантралёра ззаду, паваліў яго на зямлю, стаў наносіць удары. Добра, што побач працавалі дзве брыгады — хулігана здолелі адцягнуць ад супрацоўніка кантрольнай службы. Потым, калі кантралёр здымаў пабоі, на руках яго зафіксавалі сляды зубоў.

За месяц кантрольная служба «Брэстгартранса» штрафуе прыблізна 2000 безбілетнікаў. І гэта далёка не ўсе, хто трапляецца як неплацельшчык за праезд. Адны проста «ўключаюць хуткасць» і ўцякаюць, як тыя сапраўдныя зайцы. Іншыя аказваюцца грамадзянамі замежных дзяржаў альбо асобамі без грамадзянства. Штраф зараз складае 65 тысяч рублёў — палова базавай велічыні. Калі ж парушальнік трапляе ў міліцыю, штраф складзе ад 5 да 8 базавых велічынь, можна атрымаць суткі ці больш арышту. Адказнасць як быццам бы не зусім умоўная, але колькасць агрэсіўных пасажыраў не змяншаецца.

Людміла ФРАЛОВА 30 гадоў адпрацавала кантралёрам на брэсцкім грамадскім транспарце. Вось што яна сказала карэспандэнту газеты:

— Калі я прыйшла ў кантрольную службу маладой дзяўчынай, штрафы выпісвалі — 50 капеек. Але не гэта галоўнае. Была нейкая атмасфера ўзаемапавагі. Адзін чалавек спакойна заходзіў у аўтобус, правяраў білеты ва ўсіх пасажыраў. Калі ў каго праязнога дакумента не аказвалася, пасажыр плаціў штраф, нярэдка — са словамі прабачэння. Часам я думаю, што тады транспартам ездзіла пакаленне дысцыплінаваных і адказных людзей. Але ж і ў той час ездзілі пасажыры, каму сёння ад 50 да 70 гадоў. Гэта адна з самых агрэсіўных катэгорый цяперашніх безбілетнікаў. Пенсіянеры часта дазваляюць сабе абразу кантралёра, крык а то і абсурд кшталту «нам Прэзідэнт дазволіў». Вядома, многія з іх жывуць небагата, а штрафы цяпер немаленькія. Але людзі названага ўзросту павінны з жыццёвага вопыту ўсведамляць неабходнасць парадку ў грамадстве. А часта выходзіць — наадварот.

Ёсць яшчэ катэгорыя маладых — ім гадоў 25 — агрэсіўных «зайцоў». Такое ўражанне, што яны толькі адарваліся ад сваіх камп'ютарных стралялак і не зусім адэкватна ўспрымаюць рэальнасць. Таму і дапускаюць хамства, грубасць, а то і агрэсію. Ну а нецвярозыя пасажыры і лаюцца, і песні спяваюць, і абяцаюць, што больш не будуць ездзіць безбілетнікамі.

Пра нейкія прыкрыя выпадкі нават успамінаць не хачу, — сказала Людміла Канстанцінаўна, — іх так шмат апошнім часам, сітуацыя моцна змянілася да горшага. Здаецца, навучылася не рэагаваць на грубасць, хамства, навучылася ствараць асабістую псіхалагічную заслону. Але дакладна ведаю: каб вярнуць маладыя гады, не пайшла б на гэтую работу, выбрала б сабе нейкую іншую.

❐❐❐

Некалькі месяцаў таму «Брэстгартранс» праводзіў эксперымент: з кожнай брыгадай кантралёраў працаваў міліцыянер. Вынікі не прымусілі сябе чакаць. Агрэсіўныя безбілетнікі прыкметна паспакайнелі, штрафы заплацілі значна больш грамадзян, чым за такі ж папярэдні адрэзак часу. Таму было прынята рашэнне перайсці да такой формы работы пастаянна. Як паведаміла Маргарыта Бандура, зараз выконваюцца фармальнасці па заключэнні дагавораў з аддзеламі міліцыі. Калі ўсе дакументы будуць узгоднены, ужо ў новым годзе на лінію выйдуць кантралёры ў суправаджэнні работнікаў міліцыі. Кажуць, што да кожнага парушальніка міліцыянера не прыставіш. Але бывае, што жыццё вымушае зрабіць менавіта так...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### *«ЗАЙЦЫ» З КУЛАКАМІ*

*У Баранавічах завялі крымінальную справу ў дачыненні да пенсіянеркі, якая напала на кантралёра. Пасажырка аўтобуса паказала талон, які быў двойчы прабіты. Калі кантралёр прапанавала заплаціць штраф, пенсіянерка пусціла ў ход кулакі і тым самым нанесла цялесныя пашкоджанні супрацоўніцы аўтапарка. Зараз на агрэсіўную пасажырку заведзена крымінальная справа па артыкуле 366 Крымінальнага кодэкса (гвалт у дачыненні да службовай асобы). Дарэчы, гэта трэці выпадак агрэсіі пасажыраў у Баранавічах на працягу месяца. 22 і 29 лістапада безбілетныя пасажыры таксама адмовіліся плаціць штраф і аказалі супраціўленне работнікам кантрольнай службы. У першым выпадку гэта быў 60-гадовы пенсіянер, у другім — 26-гадовы мужчына. У дачыненні да абодвух аддзел Следчага камітэта завёў крымінальныя справы.*

# ПАД АПЕКАЮ МІКОЛЫ-ЦУДАТВОРЦА

7-гадоваму жыхару вёскі Матнявічы Чачэрскага раёна Мікалаю Патапенку (на фотаздымку) наканавана было нарадзіцца напярэдадні Міколы — святога Мікалая Цудатворцы. Толькі не зімовага, а вясновага. Тым не менш бацькі хлопчыка заўсёды ў гэтае свята (19 снежня і 22 мая) запальваюць свечкі каля абраза Цудатворцы — падарунка на сваё вяселле: у вёсцы здаўна прынята на вяселлі дарыць ікону з выявай менавіта гэтага святога. А яшчэ ў Мытнявічах дагэтуль бытуе абрад пераносу свячы і іконы Мікалая, і, калі ў сям'і Патапенкаў з'явілася пятае дзіця, да іх у хату 19 снежня «прыйшла» Мікольская свяча.

Дарэчы, у маленькага Міколы Патапенкі двое дзядоў — таксама Міколы.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**



■ Дзякуй

# ДАЙ БОГ ЗДАРОЎЯ НАШЫМ МЕДЫКАМ!

**У рэдакцыю «Звязды» звярнулася наша 83-гадовая чытачка, якая хоча падзякаваць урачам з РНПЦ анкалогіі і радыяцыйнай медыцыны, што выратоўваюць чалавечыя жыцці.**

*«Больш за 10 гадоў таму я ўжо сутыкалася з анкалогіяй, — піша яна. — І да гэтага часу бясконца ўдзячная нашым урачам з Бараўлянаў, якія вылечылі мяне, можна сказаць, падарылі мне жыццё. Але ў гэтым годзе са мной зноў здарылася бяда: я зноў захварэла, але ўжо на іншае анкалагічнае захворванне (а тое, ранейшае, як сказалі дактары, да мяне так і не вярнулася). Мяне накіравалі ў Гродзенскую бальніцу. Там доўга абследавалі, але аперыраваць урэшце рэшт адмовіліся: маўляў, сэрца ў мяне хворае, можа і не вытрымаць.*

*Тады сын папрасіў у медыкаў накіраванне і адвёз мяне зноў у Бараўляны, у РНПЦ анкалогіі і радыяцыйнай медыцыны — так цяпер называецца былое НДІ анкалогіі. Там доўга вагаліся, але ўсё ж такі шпіталізавалі мяне, падарыўшы тым самым шанц на выздараўленне. Я разумею, што нялёгка, напэўна, было прыняць рашэнне зрабіць мне аперацыю: і ўзрост у мяне паважны, і сэрца, зноў жа... Тым не менш бараўлянскія дактары адважыліся на гэта. І я бясконца ўдзячная **загадчыцы гінекалагічнага аддзялення №1 ДАЛАМАНАВАЙ Алене Веніямінаўне** за тое, што яна ўзяла на сябе такую адказнасць, і **хірургу ПЛЯТНЁВУ Андрэю Сяргеевічу**, які зрабіў мне аперацыю. Ён зусім яшчэ малады, на выгляд яму ледзь за трыццаць, я яго нават сынком называла. Але, тым не менш, гэта ўжо прафесіянал з вялікай літары, вельмі добры хірург і выдатны чалавек. Ганаруся нашымі дактарамі! А яшчэ медсястрычкамі — вельмі цяжкая ў іх праца, яны не проста добрасумленна выконваюць свае прафесійныя абавязкі, але і знаходзяць для нас, хворых, добрыя словы падтрымкі і суцяшэння. Дай ім Бог усім здароўя! Выдатныя ў нас медыкі, па меншай меры, большасць з тых, з кім мяне сутыкала жыццё. Урачоў сёння многія крытыкуюць, але вы паглядзіце, якая цяжкая і адказная ў іх праца, а зарплата не вельмі ёй адпавядае. Сёй-той, не вытрымаўшы, кідае гэтую працу, але большасць усё ж застаецца! І нізкі паклон ім ад мяне і іншых удзячных пацыентаў за гэта. Яны ратуюць нашы жыцці!»*

**З павагай, Марыя Іванаўна ГРЫЦКЕВІЧ,** *Карэліцкі раён.*

**Ад рэдакцыі:** Нам было прыемна чытаць гэты ліст. Гэта выдатна, што наша чытачка не здаецца ў барацьбе з цяжкай хваробай і што медыкі дапамагаюць ёй, нягледзячы на неспрыяльныя абставіны. Ды і заўсёды прыемна чытаць лісты, у якіх падзяка, а не чарговая скарга. Няхай бы іх было як мага больш у нашай рэдакцыйнай пошце... Марыі Іванаўне мы жадаем здароўя, доўгіх гадоў жыцця і падзяляем яе павагу і захапленне нашымі ўрачамі, большасць з якіх — таленавітыя і неабыякавыя людзі, сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы.

**Святлана БУСЬКО**

■ Музейныя ноу-хау

# ТРОХМЕРНЫ ПОГЛЯД НА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНУЮ СПАДЧЫНУ

**У рамках навукова-практычнага семінара «Музей і выклікі сучаснасці: новыя падыходы і тэхналогіі», які на днях адбыўся ў Інстытуце культуры Беларусі, сабраліся прадстаўнікі беларускіх і замежных музейных устаноў, буйнейшыя міжнародныя эксперты ў галіне музейнай справы, прадстаўнікі недзяржаўных структур, якія зацікаўлены ў развіцці найбольш актуальных кірункаў музейнай дзейнасці. У беларускіх музейшчыкаў з'явілася ўнікальная магчымасць пераняць вопыт сваіх замежных калег з Літвы і Славакіі, якія ў гэтай справе прасунуліся ўжо далёка наперад.**

— Ва ўмовах пераходу да інфармацыйнага грамадства навуковыя веды і новыя тэхналогіі становяцца вызначальнымі фактарамі сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краіны, — падкрэсліў **намеснік міністра культуры Беларусі Васіль ЧЭРНІК**, павітаўшы ўдзельнікаў семінара. — Паступова інфармацыйныя тэхналогіі ўкараняюцца ва ўсе сферы жыццядзейнасці нашага грамадства. Фарміруюцца і кампаненты інфармацыйна-культурна-адукацыйнага асяроддзя, дзе не апошняе месца займаюць музеі і музейныя ўстановы. Развіццё камунікацыйных і інфармацыйных тэхналогій адкрывае магчымасці, якія дазволяць перайсці музеям на якасна новы ўзровень развіцця з мэтай павышэння агульнадаступнасці сваіх калекцый, забеспячэння захаванасці музейнага фонду, пашырэння формаў музейнай адукацыі, міжнароднага супрацоўніцтва і прасоўвання музейных паслуг. Адным з самых перспектыўных кірункаў з'яўляецца візуалізацыя і інтэграцыя лічбавых аб'ектаў. Знаёмства з еўрапейскім вопытам па яго ўкараненні пакладзе пачатак развіцця інтэграцыйных тэхналогій у музейнай сферы ў Беларусі на якасна новым узроўні.

На думку **рэктара Інстытута культуры Беларусі Канстанціна РЭМІШЭЎСКАГА,** стварэнню інфраструктуры, неабходнай для тэхналагічна складаных працэсаў дыгіталізацыі і візуалізацыі, павінны садзейнічаць недзяржаўныя, а менавіта бізнес-структуры. «Цяпер гэта норма, што прадстаўнікі бізнес-структур ва ўмовах новай канфігурацыі ў сферы культуры Беларусі, якая фарміруецца, становяцца яе актыўнымі ўдзельнікамі, як зараз кажуць, актарамі культурнай прасторы».

Невыпадкова ў семінары прымаў удзел **генеральны дырэктар ЗАТ «БелХард Групп» Ігар МАМОНЕНКА,** які зацікаўлены ва ўкараненні высокіх тэхналогій у шматлікія гістарычныя праекты:

— З аднаго боку, гэта яшчэ адзін крок на шляху таго, каб дзякуючы высокім тэхналогіям наша культурная спадчына была даступная ўсяму свету. Тэхналагічна мы займаемся падобнымі рэчамі, у тым ліку стварэннем 3D любых аб'ектаў. Вядома, сярод іх — найбольш прамысловых. Аднак мы зацікаўлены і ў перавядзенні ў «лічбу» культурных каштоўнасцяў, каб кожны чалавек з любой краіны свету меў магчымасць калі не памацаць, дык хаця б паглядзець пэўны прадмет з усіх бакоў. Вельмі хочацца, каб гэтыя каштоўнасці не знікалі, а гісторыя, наадварот, дапамагала нам знаходзіць новыя артэфакты. Прычым Еўрасаюз гатовы фінансаваць такога роду праекты, каб аб'яднаць намаганні многіх краін, бо гісторыя не абмежавана адной тэрыторыяй.

Ініцыятарам правядзення навукова-практычнага семінара стаў **намеснік дырэктара ТАА «Тэхнамузей» Сяргей АЗАРОНАК**. Хто, як не ён, ведае, што сёння без сучасных тэхналогій немагчыма ўявіць любую музейную экспазіцыю:

— Штуршок і асноўнае развіццё сучасных падыходаў да стварэння музейных экспазіцый на прынцыпова новых узроўнях, вядома, намі быў пакладзены пры стварэнні новай экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Я з гонарам магу сказаць пра тое, што праектаванне будынка музея і стварэнне шматлікіх экспазіцый з'яўляліся вынікам працы не толькі навуковага калектыву музея, а практычна ўсіх навукоўцаў і музейных калег краіны. Са сваімі матэрыяламі праектавання мы звярталіся і да грамадства. Заўсёды даваліся вельмі канкрэтныя заўвагі, і гэта павышала якасць нашай экспазіцыі.

А тым часам, пакуль беларускія музейшчыкі расказвалі пра перспектывы ўзаемадзеяння айчынных музеяў з замежнымі, пра ўкараненне новых кампанентаў і інфармацыйных тэхналогій у музейныя экспазіцыі, пра сетку карпаратыўных музейных устаноў і новыя падыходы ва ўзаемадзеянні з сучаснымі наведвальнікамі, іх замежныя калегі дзяліліся тымі ноу-хау, якімі яны паспяхова карыстаюцца ў сваёй музейнай дзейнасці.

**Генеральны дырэктар Музея Славацкага нацыянальнага паўстання, член прэзідыума Саюза антыфашысцкіх сіл Славакіі Станіслаў МІЧАЎ** расказаў пра праект Славакіі па дыгіталізацыі ўсёй музейнай спадчыны. У праекце прымаюць удзел 32 музеі на тэрыторыі краіны, і, згодна з планам, за тры гады яны павінны алічбаваць 180 тысяч музейных прадметаў, а таксама 3 тысячы прадметаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Летась у кастрычніку ў горадзе Банска-Быстрыца адкрыўся цэнтр па алічбоўцы, дзе будзе ажыццяўляцца 30% працы па перавядзенні ў «лічбу» гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Астатнія 70% ускладзены на прыватныя фірмы.

У цэнтры знаходзіцца сучаснае абсталяванне, якое дазваляе якасна апрацоўваць музейныя калекцыі, — зазначыў Станіслаў Мічаў. — Яно дазваляе пераводзіць у «лічбу» празрыстыя матэрыялы (негатывы, дыяпазітывы), прадметы з рэльефнай паверхняй (тэкстыль), плоскія прадметы (дакументы, рукапісы). Таксама з дапамогай высокатэхналагічнага абсталявання мы маем магчымасць ажыццяўляць здымкі аб'ёмных і буйнамаштабных прадметаў, макра- і мікраздымкі. Была праблема знайсці людзей, якія маглі гэта рабіць.

Галоўная мэта праекта — высакаякасная алічбоўка найбольш значных музейных калекцый культурнай спадчыны Славакіі, ідэнтыфікацыя, захаванне і інтэграцыя лічбавых аб'ектаў з сістэмай інфармацыі, стварэнне анлайн-доступу да алічбаваных матэрыялаў, каб музейныя калекцыі былі даступныя для навуковых даследаванняў і для шырокай грамадскасці. «Гэта магчымасць рэпрадукцыі гэтых аб'ектаў, мінімалізацыі маніпуляцый з прадметам, забеспячэнне капіравання ў выпадку страты арыгіналаў, — дадаў доктар філасофскіх і кандыдат гістарычных навук С. Мічаў. — Задача, якая стаіць перад намі сёння, — выхаванне грамадскасці з дапамогай віртуальных прэзентацый музейных калекцый, анлайн-адукацыйных праграм і семінараў.

**Загадчык кафедры музеялогіі Вільнюскага ўніверсітэта Лаўжыкас РЫМВІДАС** падзяліўся вопытам прымянення трохмернага сканіравання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Літве. Таксама з дапамогай прэзентацыі прафесар паказаў магчымасці гэтага сканіравання.

— Гэта перспектыўная тэхналогія ў будучыні як для навуковых мэт, так і для камунікацый, для грамадства — лічыць Лаўжыкас Рымвідас. — Трохмерны свет для чалавека — вялікі выклік. Людзі даўно зразумелі, што ў радыусе сваіх вачэй і свайго мозга мы свет бачым трохмерным. Але калі мы спрабуем яго пэўным спосабам захаваць, у нас не атрымліваецца. Вялікі выклік для мастака, для навукоўцы і для кожнага з нас! У розныя гістарычныя перыяды ён вырашаўся рознымі спосабамі. Егіпцяне, напрыклад, прыдумалі, што лепш адлюстроўваць прадмет з таго боку, з якога ён лепш бачны. Аднак гэта было не тое, чаго хацелася. І свет заставаўся не адлюстраваным у трохмерным выглядзе, а пачуццё трохмернасці было штучным. За ўсю гісторыю навукі і за ўсю гісторыю нашага кантакту з рэальнасцю мы спрабавалі гэтага дасягнуць. XIX стагоддзе нам дало аўтаматычную фіксацыю рэальнасці: фотаздымкі, кіназдымкі, электронныя тэхналогіі сувязі. — Але праблема так і заставалася нявырашанай. І, нарэшце, гэтая тэхналогія з'явілася. З дапамогай трохмернага сканера можна зафіксаваць, напрыклад, скульптуру, а можна і якое-небудзь дрэва, якое знаходзіцца ад вас на адлегласці 10 кіламетраў, ці які-небудзь аб'ект пад зямлёй, што вельмі дапамагае пры археалагічных раскопках.

Толькі можна ўявіць, наколькі аблегчыў бы працу такі сканер беларускім навукоўцам, гісторыкам і музейшчыкам. Даследаванні праходзілі б значна хутчэй, а колькі ўнікальных аб'ектаў архітэктуры, я ўпэўнена, знайшлі б яшчэ нашы археолагі! Толькі сёння такое высокатэхналагічнае абсталяванне нам не па сілах: па-першае, няма такіх грошай, каб яго набыць; па-другое, няма спецыялістаў, якія маглі б яго засвоіць. Аднак усё наперадзе, і, як прызнаюцца замежныя госці, укладанне сродкаў у гісторыка-культурную спадчыну сёння прынясе вялікі прыбытак заўтра.

**Вераніка КАНЮТА**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## РЭЙС У ЖЭНЕВУ. З ДАЛЁКІМ «ПРЫЦЭЛАМ»

**Адбыўся першы рэгулярны рэйс Нацыянальнай авіякампаніі «Белавія» па маршруце Мінск — Жэнева — Мінск.**

Палёты ў міжнародны аэрапорт Швейцарыі будуць выконвацца самалётамі Embraer 175, CRJ-100/200 тры разы на тыдзень па аўторках, пятніцах і нядзелях. Кошт пералёту ў эканамічным класе абслугоўвання складзе ад 245 еўра «туды — назад» і ад 179 еўра ў адзін бок. У бізнес-класе ад 975 еўра «туды — назад» і ад 579 еўра — у адзін бок (аэрапортныя таксы і зборы ўключаны).

Авіякампанія разлічвае ў першую чаргу на бізнес-пасажыраў, адзначылі ў яе прэс-службе. Акрамя таго, прамыя авіязносіны будуць зручнымі для турыстаў, якія плануюць адпачынак на горных курортах Швейцарыі і Францыі. Рэйс будзе цікавым і транзітным пасажырам, якія следуюць праз Мінск далей па маршрутнай сетцы «Белавія». Акрамя таго, на гэтым новым рэйсе швейцарцам стане зручна дабірацца на чэмпіянат свету па хакеі ў маі 2014 года.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СМЕЦЦЕ НЕЧАКАНА СТРЭЛІЛА

**Пры зносе трухлявага дома супрацоўнікамі адкрытага акцыянернага таварыства «Бумажкова-агра» ў вёсцы Карма Акцябрскага раёна адбыўся выбух двух мінамётных снарадаў, расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.**



Пасля зносу нежылой хаты будаўнічае смецце вырашана было спаліць. Менавіта ў агні снарады і выбухнулі. Яшчэ адзін, цэлы, знайшоў старшыня Любанскага сельсавета на адлегласці 10 метраў. Праваахоўнікі правяраюць гэтае месца на наяўнасць іншых боепрыпасаў. Зараз пагрозы насельніцтву няма. Мяркуецца, што міны засталіся тут з часоў Вялікай Айчыннай вайны або іх нехта прынёс і захоўваў у старой пабудове.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота МНС.**

## ЗАНАДТА ДАРАГІ РАМОНТ...

**У адным з гаражоў у Гомелі позна вечарам адбылася трагедыя. Дапамагчы разабрацца з падвескай гаспадары Citroen Xantia запрасілі суседа. 34-гадовы мужчына падчас рамонту машыны выкарыстоўваў толькі дамкрат, без усякіх іншых страховачных прылад.**

Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, іншамарка ў момант знаходжання грамадзяніна пад аўто звалілася на яго. Выратавальнікі дасталі пацярпелага з-пад машыны і перадалі яго медыкам, але тыя праз некалькі хвілін канстатавалі смерць мужчыны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ТАНЦЫ З БЕНЗАПІЛАМІ

**Наведвальнікі рэстарана «Белая Русь» у Жыткавічах яшчэ доўга будуць узгадваць нечаканае шоу, якое зладзілі двое на добрым падпітку.**

28-гадовы і 34-гадовы мужчыны размахвалі перад людзьмі... заведзенымі бензапіламі. Відавочна, такім арыгінальным спосабам сябры проста забаўляліся. Сумнеўная весялосць закончылася пасля таго, як афіцыянт патэлефанавала ў міліцыю. Парушальнікі парадку (адзін з іх з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам — перапрацоўвае драўніну) пакінулі ўстанову. Афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава паведаміла, што супрацоўнікі міліцыі хутка затрымалі абодвух хуліганаў. Матывы свайго ўчынку яны не называюць. Мужчыны змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. Іх чакае пакаранне за злоснае хуліганства — да 6 гадоў пазбаўлення волі. Пры аглядзе месца здарэння на першым паверсе рэстарана на дзвярах выявілі пашкоджанні, характэрныя для ўздзеяння бензапілы. Дарэчы, ні службы аховы, ні камер відэаназірання ў жыткавіцкім рэстаране няма.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## У МІНСКІМ ЦІРЫ ЗНАЙШЛІ ТРУП СТУДЭНТА

**Трагедыя адбылася ў аўторак вечарам. Цела маладога чалавека знайшлі з агнястрэльным раненнем у галаву ў сталічным ціры. Ураджэнцу Гомельскай вобласці было ўсяго 19 гадоў, ён вучыўся на другім курсе адной з мінскіх ВНУ.**

Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па горадзе Мінску Аляксандр Герасімаў, па факце смерці хлопца Цэнтральны раённы аддзел СК праводзіць праверку. Прызначаны шэраг экспертыз. Адна з магчымых версій трагедыі — неасцярожнае абыходжанне са зброяй.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

## ЗАМЕСТ СЛОІКАЎ — ЦЫГАРЭТЫ НА 2,9 МІЛЬЯРДА

**Супрацоўнікі Віцебскай мытні ў грузавіку, які ехаў з Беларусі ў Латвію, разам са слоікамі знайшлі 560 тысяч пачкаў цыгарэт маркі «Фэст».**

Буйную кантрабанду выявілі ў рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Бігосава-1». Тытунёвыя вырабы (з беларускімі акцызнымі маркамі), папярэдні ацэначны кошт якіх больш як 2,9 мільярда рублёў, затрымалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЦЭХ ЗАПАЛАЎ УНАЧЫ...

**На прадпрыемстве «Барысаўдрэў» гарэў будынак цэха, які быў на рэканструкцыі. Пажарныя выратавалі матэрыяльных каштоўнасцяў на агульную суму каля 20 мільярдаў рублёў.**

Паводле інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, пра пажар стала вядома ў 1.41. Праз чатыры хвіліны першыя два падраздзяленні ўжо былі на месцы. Цягам наступных пяці хвілін туды ж былі прыбылі яшчэ пяць падраздзяленняў МНС. Усяго на ліквідацыі пажару былі задзейнічаны 39 выратавальнікаў і 16 адзінак спецыяльнай тэхнікі. На месца выязджаў міністр МНС Уладзімір Вашчанка.

Работнікі МНС выратавалі прыбудаваны да цэха склад, дзе захоўвалася новае абсталяванне і гатовая прадукцыя. Па папярэдняй ацэнцы, на агульную суму ў 20 мільярдаў рублёў. Ніхто не пацярпеў. Прычына пажару высвятляецца. Адна з версій: да позняга вечару папярэдняга дня падрадная арганізацыя ў будынку цэха праводзіла агнявыя работы па дэмантажы абсталявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АСВЯТЛЕННЕ ЗАПАЛКАМІ ПРЫВЯЛО ДА ВЫБУХУ

**Апёкі твару атрымалі дзве жанчыны з-за выбуху газу ў вёсцы Вышамір Рэчыцкага раёна. Сяброўкі знаходзіліся ў цаглянай пабудове, якая выкарыстоўвалася для прыгатавання ежы.**

Там была ўсталявана двухкамфорачная газавая пліта і газавы балон аб'ёмам 50 літраў. З-за адсутнасці ў памяшканні электрычнасці, для яго асвятлення, адна з жанчын скарысталася запалкамі. У выніку адбыўся выбух газапаветранай сумесі. Брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі абедзве грамадзянкі былі тэрмінова шпіталізаваны ў Рэчыцкую раённую бальніцу. У выніку разбураны шыферны дах і дзве цагляныя сцяны пабудовы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
## КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска»
### (информация о застройщике и проекте строительства)

**Застройщик** – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.11.2004 г. в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Загородный, 4-й, д. 64а.

Тел./факс 204-67-99, 252-32-18.

**Режим работы** – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1) жилой дом № 70 по ул. Одоевского;
2) жилой дом № 99В по ул. М. Лынькова;
3) жилой дом № 5 по ул. Карского;
4) жилой дом № 3 по ул. Карского;
5) жилой дом № 2 по ул. Ю. Семеняко;
6) жилой дом № 26 по ул. Ю. Семеняко;
7) жилой дом № 28 по ул. Ю. Семеняко;
8) жилой дом № 30 по ул. Ю. Семеняко;
9) жилой дом № 14 по ул. Ю. Семеняко;
10) жилой дом № 22 по ул. Ю. Семеняко;
11) жилой дом № 24 по ул. Ю. Семеняко;
12) жилой дом № 3 по ул. К.Т. Киреенко;
13) жилой дом № 3 пер. 2-й С. К.Тимошенко;
14) жилой дом № 4 по ул. Ю. Семеняко;
15) жилой дом № 6 по ул. Ю. Семеняко.

**Застройщиком получены:**

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 01.07.2011 г.;
- экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 03.03.2011 г. № 70-15/11, от 01.08.2012 г. № 392-15/12, от 25.06.2013 № 584-15/13 г.;
- решение Мингорисполкома от 26.10.2011 г. № 3256/1 о разрешении строительства;
- разрешение инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 13.02.2012 г. № 2-208Ж-127/11, от 03.06.2013 № 2-208Ж-127/11;
- договор генерального подряда с ОАО «Минскпромстрой» в качестве генерального подрядчика от 27.05.2013 г. № 9/2013.

**Информация о проекте.** Реализация проекта осуществляется на основании акта выбора места размещения земельного участка для строительства объекта «Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32А» (1-й пусковой комплекс – 2-секционный жилой дом (21-23-этажные секции №№ 3, 4), 2-й пусковой комплекс – 2-секционный жилой дом (17-21-этажные секции №№ 1, 2) и товарищество собственников, 3-й пусковой комплекс – 2-секционный жилой дом (17-19-этажные секции №№ 5, 6).

Проектная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (экспертное заключение от 03.03.2011 г. № 70-15/11, от 01.08.2012 г. № 392-15/12, от 25.06.2013 г. № 584-15/13).

Цель строительства объекта – строительство жилых помещений в жилом доме (1-й, 2-й и 3-й пусковые комплексы) для следующей категории граждан:

- для работников системы Министерства финансов Республики Беларусь, системы Министерства экономики Республики Беларусь, Департамента финансовых расследований Комитета государственного контроля Республики Беларусь, системы Комитета государственной безопасности Республики Беларусь, системы управления внутренних дел администрации Фрунзенского района г. Минска; системы управления образования администрации Фрунзенского района г. Минска, учреждений здравоохранения администрации Фрунзенского района г. Минска:

**141** квартира – для работников системы Министерства финансов Республики Беларусь, **32** квартиры – для работников системы Комитета государственной безопасности Республики Беларусь, **29** квартир – для работников системы Министерства экономики Республики Беларусь, **5** квартир – для работников Департамента финансовых расследований Комитета государственного контроля Республики Беларусь, **5** квартир – для работников системы управления образования администрации Фрунзенского района г. Минска, **2** квартиры – для работников учреждений здравоохранения администрации Фрунзенского района г. Минска, 3 квартиры – для граждан, ранее заключивших договоры создания объекта долевого строительства с РУП «Издательство «Белбланкавыд» (решение Мингорисполкома от 6 ноября 2013 г. № 2818 «О внесении изменений в решение Мингорисполкома от 16 июня 2011 г. № 1707);

- для иных категорий граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, – **175** квартир.

Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32А расположен во Фрунзенском районе г. Минска на земельном участке площадью 1,9087 га, предоставленном КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска» решением Мингорисполкома от 16 июня 2011 г. № 1707 во временное пользование сроком до 11 ноября 2014 г. для строительства объекта.

Комплекс состоит из:

6-секционного жилого дома (количество квартир – 392 ед.) переменной этажности от 17 до 23 этажей со встроенными административными и торговыми помещениями, гараж-стоянками.

Здание решено в монолитном железобетонном рамно-связевом каркасе, состоящем из монолитных железобетонных колонн, стен и жестко сопряженных с ними монолитных дисков перекрытий. Наружные стены запроектированы из керамзитобетонных камней с кладкой на клеевом растворе с утеплением по легкой штукатурной системе утеплителем из минераловатных плит. Высота этажа жилых помещений – 2,5 м.

Жилой дом оборудован всеми необходимыми инженерными системами, мусоропроводом. В секциях 17 и 19-этажных – два пассажирских лифта, один грузоподъемностью 400 кг, второй – 630 кг; в секциях 21- и 23- этажных – три лифта, два грузоподъемностью 630 кг и один 400 кг. Фундамент многоэтажной части здания – сплошная монолитная железобетонная плита на свайном основании. Витражи и заполнение оконных проемов – из профиля ПВХ с остеклением двухкамерными стеклопакетами, остекление балконов – одинарное стекло. Внутренняя отделка квартир не предусмотрена.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

**1-й пусковой комплекс 30 квартир:**

двухкомнатных – 10 квартир, из них 2 квартиры (во изменение декларации от 16.11.2013) из ранее предлагаемых;

трехкомнатных – 20 квартир.

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры в 1-ом пусковом комплексе на дату опубликования проектной декларации сформирована с учетом прогнозных индексов цен в строительстве (в расчете не учтены затраты Заказчика на охрану объекта, отопление здания за период от сдачи дома в эксплуатацию до заселения дома, не входящие в сводный сметный расчет, но относимые на стоимость строительства, которые будут выставлены дольщикам по факту произведенных затрат) и составляет:

при строительстве двухкомнатной квартиры – **13 916 000 белорусских рублей**, трехкомнатной квартиры – **13 372 000 белорусских рублей.**

